Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Незыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
Па 1 месяц . . . . . — 70 к.
„ 3 „ . . . . . 2 р. — к.
„ 6 „ . . . . . 4 р. — к.
„ 1 год . . . . . 8 р. — к.
Змена адрасу: іншагародніх—20 к. мясцовых . . . . . —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нашпарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к.
За радок нашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпецыяльныя на 50 проц. даражэй.
Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ.
За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . 15 „
Беспрацоўн. і чырвоназ'ярнейцы за дакумант . . . 15 „
За кожны дадатковы . 5 „
Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 246 (2138) Пятніца, 28-га кастрычніка 1927 г.

Адчыненьне VI-га Ўсебеларускага Зьезду Прафэсыянальных Саюзаў

адбудзецца сёньня, 28-га кастрычніка, а 6-й гадз. увечары ў Доме Культуры.

ПАРАДАК ДНЮ ЗЬЕЗДУ:

1. Аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР— тав. **КНОРЫН.**
2. Справаздача ЦСПСБ і рэвізійнае камісіі — т. т. **ПЕРАПЕЧКА і ТЭКЛІН.**
3. Становішча і пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР—т. **ГАЛАДЗЕД.**
4. Даклад Наркамгандлю БССР—тав. **БЭНЭК.**
5. Даклад Галоўсацстраху і садаклад Наркам Аховы Здароўя аб мэдыцынскім абслугоўваньні застрахаваных— т. т. **АЛЕСІН і БАРСУКОЎ.**
6. Даклад аб масавай працы саюзаў—тав. **КАПЛАН.**
7. Выбары.

Часовая мандатная камісія VI-га Ўсебеларускага Зьезду Прафсаюзаў сёньня вядзе працу з 9-й гадз. раніцы да 3-й гадз. дня ў памяшканьні Аргаддзелу ЦСПСБ.

Пралетарыят і культура.

На юбілейнай сэсіі ЦВК непасрэдна за ўхвалою маніфесту аб паступовым увядзеньні сямігадзіннага рабочага дню быў заслухан даклад Наркамасьветы аб культурных дасягненьнях савецкае ўлады за мінулае дзесяцігодзьдзе. Пытаньні культурнага будаўніцтва не выпадкова былі высунуты на першы плян. Калі ваенны адпор белагвардзейцам у першыя гады існаваньня савецкае ўлады маглі аказываць нават няпісьменныя і поўпісьменныя рабочыя і сяляне, рухаемыя стыхійнай сьвядомасьцю сваіх клясавых інтарэсаў, то сацыялістычнае будаўніцтва патрабуе ўжо больш высокага ўзроўню і палітычнае і агульнае пісьменнасьці працоўных.

Культурны заняпад—гэта праклятая спадчына самаўладзтва—становіцца тормазам разьвіцьця вытворчых сіл Савецкага Саюзу. Уздым сельскае гаспадаркі залежыць ня толькі ад недахопу матар'яльных сродкаў, але і ад коснасьці сялянскіх мас,—недарэмна аграрная прапаганда і разьвіцьцё сеткі паказальных устаноў займаюць такое вялікае месца ў дзейнасьці Народнага Камісарыяту Земляробства. У галіне прамысловасьці мы ўжо адчуваем недахоп кваліфікаваных рабочых побач з некаторымі лішкамі некваліфікаванае рабочае сілы. Словы Леніна: «Кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржаваю», прадугледжваюць узьняцьце культурнага ўзроўню гэтае кухаркі. Пралетарская грамадзкасьць заўсёды вострa адчувала неабходнасьць гэтае праблемы, і ліквідацыя няпісьменнасьці да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка была і застанецца адной з самых сур'ёзных нашых юбілейных задач.

Гэта ліквідацыя, думка аб якой упершыню была выказана Леніным, поўнасьцю да дзесяцігодзьдзя Кастрычніка ня была ажыцьцёўлена. Калі сярод мужчынскага жыхарства процант няпісьменных не перавышае 18, то сярод жанчын да апошняга часу няпісьменныя складалі каля 50 проц. Тым больш падстаў зьвярнуць максымум увагі на гэты вучастак нашага будаўніцтва.

Праўда, прафсаюзным арганізацыям удалося поўнасьцю ці амаль поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод сваіх членаў, але ў адносінах да прамысловага пралетарыяту, які зьяўляецца насьпелем дыктатуры і творцай сацыялістычнага будаўніцтва, простая ліквідацыя няпісьменнасьці ўжо нездавальняючая. Перад прафсаюзамі стаіць задача ўзьняцьця ня толькі агульна-культурнага і палітычнага ўзроўню рабочых, але і навышэньня—асабліва сярод зноў уцягваемых у вытворчасьць жыхароў вёскі—прафэсыянальна-тэхнічных навыкаў. Бо ніякая рацыяналізацыя, ніякая індустрыялізацыя ня можа даць даволі эфэкту пры культурна адсталым пралетарыяце.

Узьняцьце культурнасьці застаецца нашай ударнай задачай на другое дзесяцігодзьдзе, але ў той-жа час яно ўжо зьяўляецца вялізным дасягненьнем дзесяцігодзьдзя мінулага.

І не дарма швэйцарскія дэлегаты, якія ўпяршыню наведваюць СССР, выказваюць свой энтузіязм наконт факту, які нам прадстаўляецца самым звычайным, але які зусім нязвычайны для капіталістычных краін. „Ваш ЦВК, які праводзіць усю гэтую вялізную працу па будаўніцтву сацыялізму, увесь складаецца з рабочых і сялян", гавораць яны. «Працоўныя СССР здолелі высунуць сваіх прадстаўнікоў для кіраўніцтва ўсёй дзяржаўнай працай, і гэта кіраўніцтва дало лепшыя вынікі, чымся буржуазна-чыноўнічая культура капіталістычных краін».

Мы не памыляемся, калі скажам, што нашыя юбілейныя сьвяты зьяўляюцца ўрачыстасьцю ня толькі нашых палітычных і эканамічных заваёў, але і нашых культурных дасягненьняў. Пралетарыят будуе сацыялізм і творыць новую культуру,—гэта два бакі аднаго і таго-ж працэсу. І калі чужаземныя дэлегацыі гавораць нам, што яны прыяжджаюць да нас вучыцца нашаму вопыту, яны маюць на ўвазе ўласна тую новую, нячуваную ў сьвеце культуру, якая стварэецца ў працэсе будаўніцтва сацыялізму! І арганізаваныя рабочыя СССР маюць права сказаць, што ўся гэтая культура створана іх творчым геніем.

Чэхаславакія і СССР.

Выступленьне Бэнеша ў парляманцкай камісіі.— Камісія патрабуе хутчэйшага прызнаньня СССР.

ПРАГА, 26-Х. Чэхаславацкае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе: «Чэхаславацкі міністр замежных спраў Бэнеш выступіў у парляманцкай і сэнатнай камісіях па замежных справах з вялікаю прамоваю, прысьвечанаю бягучым пытаньням замежнае палітыкі.

Закрануўшы адносіны з Расеяй, міністр заявіў, што адносіны між абодвымі краямі разгортваюцца спрыяюча, маюць цалком карэктны характар, між краямі няма ніякіх рознагалосьсяў ці перашкод і эканамічныя адносіны палепшаюцца і ўмацоўваюцца».

Пасьля выступленьня Бэнеша ў камісіі палаты дэпутатаў па замежных справах шмат дэпутатаў выказалася па пытаньні аб дачыненьнях з СССР. **Камуністычны дэпутат Штэрн** зазначыў, што ў карысьць прызнаньня Савецкага Саюзу гавораць чыста дзелавыя падставы, і што было-б цікава заслухаць ад Бэнеша матывіроўку няпрызнаньня Савецкага Саюзу Чэхаславакіяй.

Нацыянал-сацыяліст Хружоўскі напамінае, што ў прынцыпе прызнаньне СССР было ўжо вырашана камісіяй у станоўчым сэнсе і што ўраду было даручана прызнаць СССР у адведны момант. Хружоўскі ў канцы гаворыць, што прынцып, такім чынам, ужо устаноўлен і што застаецца толькі абраць падходзячы момант.

Нямецкі сацыял-дэмакрат Поль заўважае, што Чэхаславакія надзвычайна зацікаўлена ў прызнаньні СССР і патрабуе, каб Бэнеш зазначыў на сапраўдныя прычыны, перашкажаючыя прызнаньню.

Камуністычны дэпутат Бур'ян заяўляе, што, як вявялі апошнія муніцыпальныя выбары, большасьць жыхарства вырашала пытаньне аб прызнаньні ў станоўчым сэнсе, і калі ўрад выказваецца проці прызнаньня, дык ён знаходзіцца ў поўным пярэчаньні з воляю большасьці жыхарства і дзейнічае ў духу, варожным захаваньню міру.

Нажым Антанты на Нямеччыну.

Сутнасьць мэмарандуму Гільбэрта.

БЭРЛІН, 26-Х. Учора габінэт міністра паўторна падрабязна абмяркоўваў мэмарандум генэральнага агента па рэпарацыях Гільбэрта. Зьмест мэмарандуму не агалошан.

Як паведамляюць газэты, мэмарандум заяўляе, што працяг сучаснае палітыкі пазыкі і выклікаемыя новымі законапраэктамі непатрэбныя выдаткі дзяржаўнага бюджэту прывядуць да таго, што Нямеччына ў 1928 годзе ня зможа выканаць свае рэпарацыйныя абавязацельствы. Мэмарандум падкрэсьлівае, што Нямеччына ўжо падпісала заграніцай пазыкі на суму ў 4 міліярды марак, і зазначае, што палітыка пазык павінна быць абмежавана.

«Ротэ-Фанэ» заяўляе: «Міністр фінансаў заказаў Гільбэрту мэмарандум, каб такім парадкам перашкодзіць павышэньню заработку дзяржаўным служачым».

БОЯЗЬНЬ «БАЛЬШАВІЦКАЕ ЗАРАЗЫ».

БЭРЛІН, 22-Х. Нацыянал-сацыялісцкі дэпутат рэйхстагу Радэмахер падаў наступнае запытаньне ўраду: «Водлуг поўных вестак, нямецкія больнічныя касы, па запросінах савецкага ўраду, паслалі некаторых членаў кас на расейскія курорты. Апрача аплаты кошту праезду, больнічныя касы далі магчымасьць памянёным асобам пражыць у Расеі доўгі час, нібы для мэтаў лячэньня і адпачынку. Ці вядомы гэтыя факты нямецкаму ўраду і як думае ўрад папярэдзіць паўтарэньне падобных зьявішчаў у будучым?».

НА ПРАЦЭСЕ 56-ці ВЭНГЕРСКІХ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.

НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ПРАДСТАЎНІКА ПАЛІЦЫІ ВЫКАРЫСТАЦЬ ФАЛЬШЫЎКІ ПРОЦІ АБВІНАВАЧАНЫХ.

ВЕНА, 26-Х. Учора, на 7-мы дзень працэсу, распачаўся допыт сьведак.

Першым апытваўся сьведка абвінавачаньня—намесьнік начальніка будапэшцкае палітычнае паліцыі Швэйніцэр. Ён заяўляў, што здолее 90 фатаграфічнымі здымкамі і сапраўднымі дакумантамі даказаць, што камуністы ў Вэнгрыі дзейнічаюць «па загадах, атрыманых з заграніцы», і што сацыялістычная рабочая партыя зьяўляецца толькі арганізацыяй, «прыкрываючай камуністаў».

На запытаньне старшыні аб пахаджэньні гэтых дакумантаў, Швэйніцэр заявіў, што «дакуманты належалі аднаму савецкаму пасольству заграніцаю».

Абаронца прасіў Швэйніцэра зазначыць, адкуль уласна і пры якіх абставінах трапілі да яго гэтыя дакуманты. Швэйніцэр адмовіўся адказаць па гэтае запытаньне. Тады абаронца заявіў, што «дакуманты», аб якіх казаў Швэйніцэр, **выраблены на вядомай венскай фабрыцы савецкіх фальшывак.** Некаторыя абвінавачаныя таксама заявілі наконт «дакумантаў» Швэйніцэра, што ўсё гэта фальшыўкі тыпу «ліста Зіноўева», выраблены для вядзеньня кампаніі проці СССР.

Швэйніцэр бессаромна адхіляў факт ужываньня паліцыяй катаваньняў у адносінах да абвінавачаных.

Абаронца спрасіў, чаму Швэйніцэр, які, водлуг уласных завярэньняў, быў добра інфармаваны аб вэнгерскім камуністычным руху, раней не арыштаваў Санто, кіруючага камуністычным рухам у Вэнгрыі ў працягу 8-мі месяцаў.

Старшыня суду па просьбе Швэйніцэра дазволіў яму не адказваць на гэтае запытаньне.

На запытаньне абаронцы аб лёсе прапаўшага Рубіна, арыштаванага разам з падсудныміі, Швэйніцэр заявіў, што Рубін «бясьсьледна загінуў».

Далей абаронца задаў Швэйніцэру запытаньне: «Вы спрабавалі раней з дапамогай абіцяньняў, а потым катаваньняў прымусіць абвінавачаных Леві і Сэрэньні стаць правакатарамі».

Швэйніцэр пры агульным сьмеху ўсіх прысутнічаўшых у залі адказаў: «Каралеўская вэнгэрская дзяржаўная паліцыя не карыстаецца паслугамі правакатараў».

Потым падсудныя ў вострай форме запыталі ў Швэйніцэра наконт катаваньняў. Швэйніцэр адказваў нявыразна. На дапамогу Швэйніцэру прышоў старшыня суду, які пад страхам дысцыплінарных кар забараніў абвінавачаным пытацца ў Швэйніцэра аб зьдзеках і катаваньнях паліцыі.

2 НЯЎДАЧНЫХ ПРАВАКАЦЫІ БУДАПЭШЦКАЕ АХРАНКІ.

ВЕНА, 26-Х. З тае прычыны, што выкрытая на працэсе Санто дзейнасьць вэнгерскае паліцыі выклікала абурэньне сусьветнае грамадзкае думкі і ганьбу нават з боку чужаземнага кансэрватыўнага друку, начальнік будапэшцкае паліцыі Хэтэньі спрабаваў шляхам паліцэйскага труку інсцэніраваць выкрыцьцё нібы новае камуністычнае змовы, каб адцягнуць увагу грамадзкае думкі ад тых катаваньняў, якімі паліцыя карысталася пры допыце абвінавачаных. Паліцыя пры дапамозе вядомага правакатара Юбэра хацела «накрыць» некалькіх рабочых у памяшканьні сацыялістычнае рабочае партыі, арыштаваць іх па падставе так званых паказаньняў агэнтаў, нібы «камуністы меркавалі ў дзень гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі арганізаваць у Будапэшце крывавыя дэманстрацыі».

Маневр паліцыі ня ўдаўся, бо ўсе чуўшы ўчора ноччу ў памяшканьне сацыялістычнае рабочае партыі 50 паліцэйскіх не знайшлі там нікога.

Пасьля гэтае няўдалае спробы Хатэньні надумаўся «выкрыць змову» ў самой залі пасяджэньня суду. Для гэтае мэты каля дзесятка сышчыкаў былі пераадзеты рабочымі і пасланы на пасяджэньне суду. Водлуг пляну паліцыі адзін з шпіёнаў павінен быў у часе ходу пасяджэньня заявіць, што прысутнічаючыя тут рабочыя ўмаўляюцца аб арганізацыі крывавае дэманстрацыі. Але і гэты плян Хатэньні пацярпеў крах, бо ў самым пачатку пасяджэньня адзін з абвінавачаных Тысо выскачыў і, паказаўшы на аднаго з шпіёнаў, якія сядзелі ў залі суду, сказаў: «Гэты чалавек вельмі кепска са мною абыходзіўся, а цяпер яшчэ мае права прыходзіць сюды».

Старшынствуючы запытаў імя таго, на каго зазначыў Тысо. Выявілася, што гэта быў сышчык. Старшыня затрэбаваў неадкладнага выводу сышчыка. Адначасна іншыя абвінавачаваемыя выкрылі і іншых шпіёнаў, зазначыўшы, што яны катавалі абвінавачаных. Шпіёны прымушаны былі пакінуць залю пасяджэньня, і такім чынам спроба Хатэньні папярпела крах.

Амэрыканская нота Францыі

ПАРЫЖ, 25-Х. Францускае міністэрства замежных спраў атрымала новую ноту ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў наконт францускіх нытных тарыфаў.

Заяўляюць, што нота складзена ў заміраючых выразах і дае магчымасьць пачаць перамовы.

САВЕЦКА-ЛАТВІЙСКАЯ ЗГОДА РАТЫФІКАВАНА.

РЫГА, 26-Х. А 12 гадзіне ночы сойм большасьцю 52-х проці 45-ці пры 2-х, якія ўстрымаліся, ратыфікаваў савецка-латвійскі гандлёвы ўгавор.

СКАНДАЛ ПРЫ АБГАВОРЫ ЗГОДЫ Ў СОЙМЕ.

РЫГА, 26-Х. У часе абмеркаваньня савецка-латвійскага ўгавору ў сойме выказвалася 25 прамоўцаў, з іх—10 прадстаўнікоў апазіцыі. Кампанія апазіцыі проці ўгавору дасягла вышэйшае меры ў апошні дзень абмеркаваньня. Апазіцыйны друк проста пагражаў «непрадкамі ў армії», якая нібы рашуча настроена проці ўгавору.

У часе прамовы арцыбіскупа Яна, меўшае выразна правакацыйны характар, адбыўся нячуваны ў гісторыі сойму скандал. Ян, выступаючы проці ратыфікацыі, абвінавачваў сацыял-дэмакратаў у тым, што яны „падслугоўваюцца да Масквы". „Хоць дзесятак дробных шпіёнаў,—сказаў Ян, цяпер арыштаваны, але буйныя шпіёны сядзяць высока, прыкрываючыся недатычнасьцю". Пры гэтых словах на лаўках сацыял-дэмакратаў узьнікла страшэнны шум пратэсту. Ян прымушаны быў спыніць сваю прамову. Па адрасе яго чуліся выгукі: „царскі халоп", „Распуцін", „кат", „паганец" і г. д. Не зважаючы на ўсе стараньні прэзыдыуму, не ўдалося адналіць парадак, і пасяджэньне было спынена. У часе перапынку Ян папрасіў прабачэньня перад прэзыдыумам, а перад аднаўленьнем пасяджэньня—і перад пленумам. Гэтым скандал быў ліквідаваны. Галасаваньне па вымаганьні апазіцыі рабілася паймённа.

КАСТРЫЧНІКАВАЯ ПЕРАКЛІЧКА.

2 заграничных дэлегацыі пралетарыяту СССР.

МАСКВА. 10-цігодзьзе Кастрычнікавае рэвалюцыі будзе адзначана пасылкаю за граніцу 2-х савецкіх рабочых дэлегацый: адна дэлегацыя ў складзе 12 чалавек камандыруюцца ў Нямеччыну, а другая ў складзе 11 чалавек—у Чэхаславакію.

Спатканьне рабочых СССР з рабочымі Нямеччыны і Чэхаславакіі мае мэтаю ўзаемнае азнаямленьне з умовамі працы і быту рабочых гэтых краёў, а таксама супольнае сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя Кастрычніка.

Прэзыдыум УЦСПС ужо зацьвердзіў склад абедзьвюх дэлегацый. Удзельнікі дэлегацыі—радавыя рабочыя і пізавыя прафпрацаўнікі Масквы, Ленінграду, Украіны і, між іншым, Донбасу, Уралу, Сібіры, Івана-Вазьнясенску і Новарасейску.

Падрыхтоўка да кастрычнікавых сьвят у Мэксіцы.

МЭКСІКА, 26-Х. Камуністычная партыя, антыімпэрыялістычная ліга, мэксіканская сэкцыя МОПР, нацыянальная сялянская ліга і іншыя арганізацыі рыхтуюцца да супольнага сьвяткаваньня 10-тых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі. Паўнамоцнаму прадстаўніку пасланы запросіны ўзяць удзел у сьвятах.

7-га лістапада адбудзецца ўрачыстае адчыненьне новага будынку паўнамоцнага прадстаўніцтва. У новым памяшканьні будзе знаходзіцца прадстаўніцтва ўсіх кіно (адчыняецца спэцыяльная заля для дэманстрацый савецкіх фільм), а таксама гандлёвае прадстаўніцтва СССР.

Шырокі размах савецка-амэрыканскага гандлю.

НЬЮ-ЁРК, 25-Х. З 1-га кастрычніка 1926 г. да 30 верасьня 1927 г. зварот савецка-амэрыканскага гандлю складаў 78 міліёнаў 380 тысяч даляраў, проці 65 міліёнаў 328 тысяч даляраў леташняга году. У гэтую лічбу ня ўключаны звароты Чыатурскае марганцавае канцэсіі (2 міліёны 900 тысяч даляраў) і вывезеныя ў Амэрыку футры.

Экспорт з Амэрыкі ў СССР склаў 63 міліёны 524 тысячы даляраў, г. зн. у параўнаньні з леташнім годам павялічыўся на 22 проц. Вываз з СССР у Амэрыку складаў 14 міліёнаў 586 тысяч даляраў, г. зн. павялічыўся проці леташняга году па 14 проц.

Паўстаньне ў Мэксіцы не заціхла.

МЭКСІКА, 26-Х. Барацьба ўрадавага войска з асобнымі атрадамі паўстанцаў ня спыняецца. У бойцы недалёка Арызаба забіт генэрал, камандаваўшы ўрадавым войскам, аднак урадавае войска разагнала паўстанцаў.

У некаторых раёнах Мэксікі паведы ноччу ня ходзяць.

Перамога Алёхіна.

БУЭНОС-АЙРЭС, 26-Х. 21-ая партыя матчу Алёхін-Капабланка скончылася перамогай Алёхіна на 32 ходзе.

Барацьба кітайскіх мілітарыстаў.

Перамогі паўночцаў.

ПЕКІН, 26-Х. Атрыманая у Пекіне тэлеграма Чжан-Цзун-Чана гаворыць, што шаньдунскае войска заняло Кайфынь 25-га кастрычніка. Шаньдуньскія панцырнікі прайшлі ў Хан-Чуан, разьмеркаваны за 56 кілёмэтраў ад Чэньчжоу. Учора мукдэнскі вайсковы аэраплан зрабіў палёт над Тай-Юан-Фу (галоўны горад правінцыі Шаньсі), дзе скінуў 4 бомбы. Адна з гэтых бомбаў трапіла ў арсэнал, а іншыя—у галоўны штаб шансійскае арміі.

10 КАРАЎ СЬМЕРЦЮ Ў ПЕКІНЕ.

ПЕКІН, 25-Х. Сёньня пакарана сьмерцю 5 рабочых, арыштаваных 17-га кастрычніка за распаўсюджваньне антыўрадавых праклямацый, і 5 студэнтаў, арыштаваных на мінулым тыдні ў Тан-Бэй-Іне, дзе быў выкрыт склад прапагандысцкае літаратуры.

„Ротэ-Фанэ" аб выключэньні Троцкага і Зіноўева.

«Правадары апазіцыі ізалявалі сябе ў міжнародн. рабочым руху».

БЭРЛІН, 26-Х. Абмяркоўваючы пастанову аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні Троцкага і Зіноўева з ЦК УсеКП(б), «Ротэ Фанэ» піша:

„Выключэньне Троцкага і Зіноўева з ЦК сьведчыць, што ЦК УсеКП(б) цьвёрда вырашыў прытрымлівацца ўстаноўленага пад кіраўніцтвам Леніна і ўхваленага ўсёй партыяй палітычнага напрамку і прытрымлівацца гэтага напрамку проці калісьці заслужаных рэвалюцыянэраў, без усякіх уступак, рашуча захоўваючы адзінства і аб'яднанасьць партыі.

Усе „прароцтвы" Зіноўева і Троцкага адносна пагражаючае катастрофы не маглі адхіліць бальшавіцкую партыю ад не шляху і пахісьнуць посьпехі сацыялістычнага ўраду. Зіноўеў і Троцкі папер самі ізалявалі сябе як у Савецкім Саюзе, так і ў міжнародным рабочым руху. Затое яны спаткаюць ухвалу з боку міжнароднае буржуазеі і антысавецкіх элементаў у СССР. Справе рэвалюцыі можна служыць толькі з Камінтэрнам, з ленінскай партыяй".

У панскай Польшчы.

БЕЛАРУСКІЯ ШКОЛЫ Ў ПАЛЕСКІМ ВАЯВОДЗТВЕ.

На ўвесь Палескі райён Польшчы маюць быць адчынены ў гэтым годзе толькі 5 беларускіх школ і 10 двузьлычных, якія, як вядома, мала чым розьняцца ад польскіх.

ПРЫГАВАР НАД УКРАІНЦАМІ.

Адбыўся працэс 36 украінцаў, які цягнуўся ў Кракаве пяць тыдняў. Іх абвінавачвалі ў шпіянажы. 11 абвінавачаных апраўдана. Рэшта прыгавораны да катаржнай турмы ад 10 мес. і вышэй. І. Пінчынская прыгаворана на 5 гадоў, В. Колодый і П. Заблоцкі—на 4 гады.

АХВЯРЫ У МУЗЭЙ ІМЯ ІВ. ЛУЦКЕВІЧА.

Як вядома, у Вільні існуе беларускі музэй імя І. Луцкевіча, які заложан быў нябожчыкам, дзякуючы неаслабнай энэргіі. Цяпер музэй разрося і стаў вядомы шырокім беларускім масам, якія складаюць у яго розныя археалёгічныя, мастацкія і інш. рэчы. Апошнімі днямі ў музэй паступіла шмат рэчаў.

АПОШНІЯ ВЕСТКІ.

(Атрыманы а 1 гадзіне ўночы).

ФРАНЦУСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ НА ВАРЦЕ РАСЕЙСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

ПАРЫЖ, 27-Х. Сёньня адбыўся мітынг прапаганды захаваньня франка-савецкіх адносін, скліканы францускай сац. партыяй. Народу сабралася надта многа. Дакладчык Леон Блюм зазначаў, што цяперашняе напружанае становішча франка-савецкіх адносін зьяўляецца вынікам разрыву дыпляматычных адносін між СССР і Англіяй, наступам нафтавых трэстаў і паходу, пачатага ў лінені міністрам унутраных спраў Сарро. Ня трэба думаць, па словах Блюма, што адкліканьне Ракоўскага задаволіць ворагаў СССР у Францыі. Яно ўтварыла для іх толькі прэтэндэнт, які яны выкарыстаюць, каб патрабаваць высылкі ўсякага іншага пасла СССР пад прычынай, што ён зьяўляецца аўтарам якогасьці артыкулу ці якойсьці заявы.

Далей Блюм падкрэсьлівае ніправільнасьць агрэсыўнай палітыкі ў адносінах да СССР. Блюм зазначаў на апаску вайны, якая надта ўзмацнілася-б у выніку франка-савецкага разрыву. Далей выступаў Лойнэ, Осьмен і інш. Осьмен, між іншым, заявіў, што француская сацыялістычная партыя будзе змагацца са здраднікімі інтрыгамі, накіраванымі супроць СССР і будзе бараніць захаваньне дыпляматычных адносін з СССР, «ня гледзячы на абмылкі, якія могуць рабіць члены маскоўскага ўраду». Зачыняючы мітынг, Браке заклікаў да абароны расейскай рэвалюцыі.

АДПОР АПАЗІЦЫЯНЭРАМ НА СХОДАХ ПАРТАКТЫВАЎ МАСКВЫ.

МАСКВА, 20-Х. 27 кастрычніка ва ўсіх раёнах Масквы адбыліся надзвычайна шматлюдныя сходы партактываў, якія абмяркоўвалі пастановы апошняга пленуму ЦК. На Красной Прэсьне на сходзе партактыву прысутных было 3.000 чал., у Замаскварэччы—2.500 ч., у Рагоска-Сімаўскім раёне—1.500 чал. З дакладамі аб пленуме выступалі т. т. Андраеў, Яраслаўскі, Русіновіч і інш. Спробы паасобных нямногіх апазіцыянэраў, у тым ліку Ракоўскага, Каменева, Сасноўскага і інш., выступіць з абвіненьнямі супроць партыі, спаткалі рэзкі і заслужаны адпор.

На сходах ухвалены амаль усюды аднагалосна рэзалюцыі, якія здобрываюць як тэзісы к 15 парт. зьезду, ухваленыя пленумам, так і пастановы пленуму аб выключэньні са складу ЦК Троцкага і Зіноўева.

Партактыў Масквы ў самай рэзкай форме асудзіў чынны апазіцыі і патрэбаваў ад ЦК, у выпадку няспыненьня раскольніцкай дзейнасьці з боку апазіцыянэраў, зараз-жа выключыць іх з шэрагаў партыі.

ПРАЦЭС БІРКА.

РЭВЕЛЬ, 27-Х. Пачаўся працэс Бірка, былога эстонскага пасла ў СССР.

За дзень.

Апраўданьне Шварцбарда.

Фактычна працэс Шварцбарда ў Парыжы быў працэсам пятлюраўшчыны, усіх пагромшчыкаў, апраўданьня якіх дамагаліся кадэты і контр-рэвалюцыянэры ўсіх масьцяў і афарбовак.

Уся замежная эміграцыя, нават расейскія кадэты, якія ў свой час змагаліся супроць аўтанамісцкіх ухілаў Пятлюры, і тыя на гэтым працэсе аб'ядналіся для таго, каб апраўдаць пагромшчыкаў і прысудзіць Шварцбарда, які забіў гэтага забойцу шмат сот рабочых і сялян Украіны. Контр-рэвалюцыянэры хацелі выкарыстаць гэты суд супроць савецкай улады, абвінавачваючы саветы ў тым, што нібы яны зьяўляюцца віноўнікамі пагромаў на Украіне. Гэты плян контр-рэвалюцыйнай эміграцыі адразу быў сарваны хоць бы тым, што нават сьведкі абвінавачаньня Шварцбарда прымушаны былі зазначыць, што Пятлюра ў часе пагромаў ня прымаў ніякіх захадаў да спыненьня іх, а вельмі часта перад усім строем дзякаваў асобных атаманаў за добрае выкананьне пагрому.

Не дапамаглі таксама і правакацыйныя выбрыкі, што нібы Шварцбард зьяўляецца «агентам ЧК». Сьведка Сьліозбэрг—правы кадэт, заўзяты вораг бальшавізму—паказаў суду ліст Бурцэва, у якім ён ручаецца, што Шварцбард ніякіх адносін да бальшавізму і ЧК ня мае. Стары сыяніст—вораг бальшавізму Цёмкін сказаў: «Стаючы на мяжы свайго жыцьця я клянуся, што Пятлюра адказны за пагромы на Украіне».

Нават суд францускіх мяшчан прымушан быў згадзіцца з абаронай Шварцбарда, што ён пастуціў правільна, забіўшы Пятлюру. Гэтым самым францускі суд і ўся францускам грамадзкасьць асудзіла пятлюраўшчыну і пагромшчыкаў.

Латвійскі сойм прыняў гандлёвы дагавор.

Пасьля досыць доўгай адцяжкі, у часе якой адбывалася барацьба працыўнікаў з прыхільнікамі савецка-латвійскага гандлёвага дагавору, гэты апошні прыняты латвійскім соймам большасьцю 52 проці 45, пры двох устрымаўшыхся.

Гэтым значнай вагі і для Латвіі і для нас актам скончылася барацьба ня толькі латвійскіх партый і інтарэсаў,—гэтым скончылася ў Латвіі барацьба ангельскіх уплываў з уплывамі СССР.

Латвійскаму народу трэба было выбіраць: або пакланіцца ваенна-фашыстаўскаму боту, кіраванаму з Лёндану, які мае на мэце падпарадкаваць інтарэсы слабейшых дзяржаў сваім інтарэсам і папхнуць іх на сьмяротную бойку, а можа і на гібель у барацьбе з СССР; або, гледзячы на сябе, на свой лёс і сваё эканамічнае, палітычнае і геаграфічнае палажэньне, да гаварыцца з СССР беспасрэдна дызасьпечыць сабе ня толькі жыцьцё і граніцы, але і гаспадарчы дабрабыт.

Латышы выбралі тое, што лічылі для сябе больш карысным.

Аднак, відаць, латвійская буржуазея, хоць і вельмі слабая, глыбока заразілася фашыстаўскімі хваробамі. У латвійскай буржуазнай прэсе вялася страшэнная агітацыя проці дагавору з СССР. Заварушыліся было і фашыстаўскія арганізацыі, так што прыхільнік згоды з СССР міністр замежных спраў Латвіі гр. Цэленс выступаў нават у сваім часе з адозвай, якая заклікала латвійскіх работнікаў стаяць на варце ў поўнай баявой гатоўнасьці.

Розум большасьці латвійскага народу перамог. Ён не спалохаўся ангельскіх пагроз, як і розных іншых рагатак, якія расстаўляла тая-ж ангельская дыпляматыя, у відзе незадаволеньня яскрава-буржуазнага ўраду Эстоніі, якая ўжо даўно запрадалася Англіі, а таксама і перасьцярог польскай і фінляндзкай прэсы амаль ня ўсіх кірункаў. Абруч, які хацела Англія моцна сьцягнуць навакол СССР, ня вытрымаў і трэснуў.

Гэты посьпех нашай дыпляматы разьбіў ангельскі плян ваеннага і эканамічнага акружэньня СССР і адрэзаньня яго ад рэшты Эўропы.

Будзем спадзявацца, што і іншыя балтыцкія дзяржавы па прыкладу Латвіі ў хуткім часе заключаць з намі нармальныя гандлёвыя дагаворы на сваю і нашу карысьць.

Але гэта будзе лягчэй зрабіць тады, калі ўсе балтыцкія дзяржавы вызваляцца ад чужаземных уплываў.

Фарысеі і падхалімы.

У 1925 годзе гэтак званы інтэрнацыянал гарнякоў зьбіраўся паслаць дэлегацыю ў СССР. Нямецкі член гэтае дэлегацыі абраў сваім перакладчыкам расейца, контр-рэвалюцыйнага меншавіка. Гэты меншавік быў высланы за свае злачынствы проці рабоча-сялянскае ўлады з Савецкага Саюзу і заграніцаю ня спыняў сваю барацьбу проці СССР. За яго злачынствы яму быў забаронен прыезд у межы Савецкіх рэспублік. Не зважаючы на гэта, інтэрнацыянал гарнякоў ня толькі дамагаўся, каб яму дазволілі прыезд у СССР, але нават дайшоў да такой нахабы, што патрабаваў спэцыяльных гарантый, што ні адзін волас не спадзе з галавы гэтага контр-рэвалюцыянэра, што-б ён ні зрабіў у часе свайго знаходжаньня ў СССР.

Савецкі ўрад, ужо раней забараніўшы гэтаму меншавіку прыезд у межы СССР, не палічыў магчымым толькі таму, што інтэрнацыяналу гарнякоў уздумалася прывозіць кантрабандай у СССР меншавікоў, адміньіць сваю ранейшую пастанову.

Кіраўнікі інтэрнацыяналу надзвычайна абразіліся за гэта. «Пасьля такой страшэннай зьнявагі мы ня едзем у СССР», заявілі ў адзін голас незалежныя правадыры гэтак званага інтэрнацыяналу горнарабочых. Мінула два гады. Гэтымі днямі павінна было адбыцца ў Варшаве пасяджэньне выканкому інтэрнацыяналу горнарабочых. На гэтым пасяджэньні павінен быў браць удзел і Кук. Але польскі ўрад адмовіў яму ў візе. Тады і другі ангельскі дэлегат Рычардсон, якому быў выдадзен дазвол на выезд у Польшчу, адмовіўся туды ехаць.

А горды выканком незалежнага інтэрнацыяналу? Ён са спакойным сумленьнем сабраўся ў Варшаве. Яго, відавочна, мала зьнепакоіла тое, што Пілсудзкі ўзяў на сябе [illegible] фактычнага кіраўніка інтэрнацыяналу, пастанаўляючы каму можна і каму нельга ўдзельнічаць на пасяджэньні апошняга. Бо фашысцкі ўрад Польшчы—

У Саюзе ССР.

ПАРТЫЯ ПРОЦІ АПАЗІЦЫІ.

Днепрапятроўская партарганізацыя ўхваляе мерапрыёмствы ЦК.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 26-X. Аб'яднаное пасяджэньне бюро акругкому і прэзыдыуму акр. КК цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічачы выключэньне з ленінскага ЦК дэзарганізатараў і раскольнікаў партыі правільным і адпавядаючым пастанове 10-га партыйнага зьезду.

Бюро акругкому і прэзыдыуму акрКК заклікаюць усіх членаў і кандыдатаў днепрапятроўскае арганізацыі ня спыняць практычную працу па падрыхтоўцы да X-га партыйнага зьезду на падставе ўнутрыпартыйнае дэмакратыі, даючы жалезны адпор раскольнікам і дэзарганізатарам партыйных мэрагаў.

Харкаўцы дадуць адпор спробам дэзарганізацыі.

ХАРКАЎ, 26-X. Пленум харкаўскае акр. КК, а таксама пленум акругкому цалкам ухвалілі рэзалюцыю, у якой лічаць правільным выключэньне Зіноўева і Троцкага з складу ЦК і ўхваляюць пастанову аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК па пытаньнях правядзеньня перадзьездаўскае дыскусіі, лічачы неабходным папярэдзіць, што ўсялякім спробам выкарыстаць волю меркаваньняў і крытыкі недахопаў партыі у мэтах групавых і фракцыйных, будзе дадзен рашучы адпор усёй партыйнай арганізацыі.

Фракцыянэры ў Іркуцкай партарганізацыі.

ІРКУЦК, 26-X. Бюро камітэту партыі і прэзыдыум кантрольнае камісіі разабралі на аб'яднаным пасяджэньні справу групы фракцыянэраў пад кіраўніцтвам прыбыўшага з Масквы настаўніка ўнівэрсытэту, ранейшага эсэра Фуртычова, наладжваючае супольна з беспартыйнымі сходы і размнажаючае антыпартыйную літаратуру. У сваім маральным развале фракцыянэры дайшлі да таго, што ўтаілі перад удзельнікамі сходу прозьвішча Фуртычова, імкнучыся загадзя дыскрэдытаваць 15-ы партыйны зьезд і прапанавалі, у выпадку допыту партыйных органаў, не выдаваць арганізатараў сходу, а ў выпадку выключэньня з партыі не аддаваць партыйных білетаў.

Замест шчырага прызнаньня ў сваіх злачынствах апазіцыянэры спрабавалі ашукаць парткалегію.

Кіраўнікі сходу Фуртычоў, Міхайлаў, Полазаў выключаны з партыі. Двом, уцягнутым у фракцыйную працу партыйцам, абвешчан суровы выгавар з папярэджаньнем.

Прафрух СССР ганьбіць раскольніцтва апазіцыі

Пастановы пленумаў ЦК мэталістаў, хімікаў і с.-г. рабочых.

МАСКВА. Пленум ЦК саюзу мэталістаў, цалкам і поўнасьцю далучаючыся да ацэнкі дзейнасьці прэзыдыуму УЦСПС, зробленае на апошнім пленуме УЦСПС, з свайго боку выказвае абурэньне і пратэст проці тых начуваных, неабгрунтаваных нападак і кампаніі паклёпу на УЦСПС, якія былі зроблены асобнымі апазіцыянэрамі з складу пленуму УЦСПС, спрабаваўшымі сарваць дзелавую працу пленуму свайёй раскольніцкай і фракцыйнай палітыкай.

Пленум ЦК саюзу хімікаў ад імя 250 тысяч рабочых-хімікаў заявляе, што саюз хімікаў дасьць дружны адпор дэзарганізатарскім выпадам апазіцыі і ў далейшым з напружанай энэргіяй будзе весьці працу на галоўным вучастку нашае гаспадаркі—хімічнае прамысловасьці.

На сёньнешнім пленуме ЦК саюзу сельска-гаспадарчых рабочых старшыня ЦК саюзу Анцаловіч пад гучныя воплескі ўсіх прысутных заявіў, што сельска-гаспадарчы пралетарыят прызнае кіраўніцтва УЦСПС правільным і цалкам далучаецца да ацэнкі працы апазіцыі, дадзенае ўсімі савецкімі прафарганізацыямі.

Пераход на 7-мігадзінны рабочы дзень.

МАСКВА. Галоўтэкстыль падасьць у бліжэйшы час у прэзыдыум ВСНГ СССР прапанову аб пераводзе яшчэ ў гэтым годзе для вопыту некальких тэкстыльных фабрык на тры зьмены пры 7-мігадзінным працоўным дні ў Івана-Вазьнясенскім, Сярпухоўскім, Арэхаўскім і Уладзімірскім райёнах.

Адчыненьне музэю Леніна.

МАСКВА. 27-га кастрычніка пасьля перапынку ізноў адчыняецца музэй Леніна. Гістарычны аддзел пашыран у два разы. З неагалошаных фатаграфічных здымкаў найбольш цікавымі зьяўляецца „Ленін у грыме"—фатаграфічны здымак Леніна, загрыманаванага пад рабочага Сестрарацкага заводу тав. Іванова, на пашпарце якога Ленін жыў у 1917 годзе пасьля ліпнёўскага паўстаньня.

Навіною зьяўляецца жыцьцёпісная выстаўка, на якой будуць эгзапаваны ўсе друкаваныя творы—першыя выданьні Леніна з сакавіка 1917 г. і канчаючы ўстаноўчым зборам у пачатку 18 г. Апрача таго, на выстаўцы будуць усе кніжкі і газэты, друкаваўшыя аб Леніне, як буржуазныя, так і меншавіцкія.

У так званым „зборным" аддзеле, дзе сабраны ўласныя рэчы Леніна і атрыманыя ім падарункі, прыбавілася шмат новых экспанатаў, як напр.: шахматны стол і шахматы, атрыманыя Леніным у падарунак у 1923 г. у дзень 50-цігодзьдзя яго нараджэньня ад супрацоўнікаў ЦК УсеКП(б).

Усе фігуры шахматаў уяўляюць сабою буйнейшых палітычных дзеячоў таго часу. Чырвоны кароль і каралева ўяўляюць рабочага і селянку, іншыя фігуры—Сталіна, Чычэрына, Томскага, Фрунзэ і інш. Чорныя фігуры ўяўляюць сабою—Мілюкова, Пурышкевіча, Маркава 2-га і інш. Шахматы—працы мастацкае майстэрні ВХУТЭМАС'а. Таксама зьяўляецца цікавым вінтоўка, падараваная Ільічу тульскімі рабочымі з чулым адрасам і срэбная нафтавая вышка, падараваная Леніну рабочымі нафтавых промыслаў.

Кангрэс прыяцеляў СССР.

МАСКВА. Адчыненьне кангрэсу прыяцеляў СССР намечана на 10-га лістапада ў 6 гадз. увечары ў Калённай залі Дому Прафсаюзаў. Парадак дню кангрэсу намечан наступны: вынікі сацыялістычнага будаўніцтва СССР, пагроза вайны і абарона СССР.

Задачы мясцовых АПО ў кастрычнікавую кампанію.

МАСКВА. Агітпроп ЦК дае параду агітпропам мясцовых партыйных камітэтаў праводзіць на ўсіх рабочых і сялянскіх сходах даклады на наступныя тэмы: Кастрычнік, яго падрыхтоўка і значэньне; вынікі эканамічнага будаўніцтва СССР за 10 гадоў, вынікі культурнага будаўніцтва; Кастрычнік і агульныя вынікі за 10 гадоў.

Ва ўсёй кампаніі павінна быць шырока выкарыстана выдадзеная да юбілею літаратура, а таксама асноўны мясцовы матар'ял аб Кастрычнікавым перавароце, барацьбе і будаўніцтве за дзесяць гадоў.

Зьніжэньне цэн на будаўнічы матар'ял.

МАСКВА, 26-X. Загадам па ВСНГ СССР прапанавана ўсім падведамсьцьвенным ВСНГ прадпрыёмствам зьніжць з 1-га кастрычніка 1927 г. адпускныя цэны на будаўнічыя матар'ялы ў разьмеры ад 4 да 10 проц.

Масавая газэта „Рабочая Копейка".

МАСКВА. ЦК прызнаў патрэбным, для абслугоўваньня друкам новых гушчаў рабочых, пядаўна прыбыўшых з вёскі і яшчэ не ахопленых уплывам партыйнага і савецкага друку, выдаваць штодзённую папулярную масавую газэту «Рабочая Копейка». Выданьне апошняе даручана выдавецтву «Правда» з тым, аднак, каб рэдакцыі бочей Копейки» была забясьпечана самадзейнасьць.

Весткі адусюль.

МАРСКАЯ КАТАСТРОФА.

Большасьць пасажыраў адратавана.

РЫМ, 26-X. Агэнцтва Стэфані паведамляе: „Водаўг апошніх вестак з ліку людзей, якія знаходзіліся на „Прынчыпэса Мэфалэда" выратавана 1200 чалавек. Такім чынам, лік ахвяр менш значны, чым меркавалася раней, бо ўсяго на параходзе знаходзілася 968 пасажыраў і 240 чалавек экінажу. Італьянскаму пасланьніку ў Рыё дэ-Жанэйра дадзены шырокія паўнамоцтвы на аказаньне неабходнае дапамогі пасажырам і экінажу судна".

Нямецкая сялянская дэлегацыя.

БЭРЛІН, 26-X. Згодна запрашэньня савецкіх сельска-гаспадарчых наапэратываў, сёньня ў СССР выехала 10 прадстаўнікоў нямецкага дробнага і сярэдняга сялянства з мэтаю вывучыць эканамічнае становішча СССР.

Выбух на капальнях у Турцыі.

АНГОРА, 25-X. Пажар на волава-срэбных капальнях у Болія, узьнікшы ў выніку выбуху, ня спыніўся ў працягу 17 гадзін. Страты прыблізна 500 тысяч фунтаў. Ёсьць чалавечыя ахвяры.

ПАЕЗДКА Ў ЗАБАСТОВАЧНЫ РАЙЁН *).

(Ад нашага карэспандэнта).

Гальле, 20 кастрычніка.

Сярэдняя Нямеччына—край, у якім цяпер сотні тысяч гарняцкіх сем'яў з упартай адназгоднасьцю вядуць барацьбу за большую колькасьць хлеба.

Гэты забастовачны райён мае сваю ўласную, вялікую гісторыю. Тут у вялікодным тыдні 1921 г. камуністычнае паўстаньне дасягнула свае найбольшае вышыні. Тут змагаўся Макс Гёльц і рабочыя вялізнае хімічнае фабрыкі Леўна на працягу шматлікіх дзён абаранялі сваю фабрыку проці атраду паліцыі. Тысячы рэвалюцыйных рабочых загінулі ўжо тут.

Рабочыя пакідаюць працу.

Адзін з найбяднейшых райёнаў Нямеччыны. Толькі нетры зямлі багатыя. Вугольле! Багатыя толькі ўласьнікі капальняў, электроўняў, хімічных фабрык, Рабаўнікі!

Усе іншыя—бедныя. Як можа вялікая сям'я з многімі дзяцьмі жыць на 40-50 р. у месяц, калі фунт мяса каштуе рубель? Як могуць быць здаровымі дзеці, калі ўжо іх бацькі і дзяды галадавалі? Як можа рабочы думаць аб паправе здароўя, калі ён мусіць працаваць 11 і 12 гадзін штодзённа?

Фабрыка каля фабрыкі, бязконцыя рады малых, чатырохкантовых, брудных хатак. Ні адзін комін ня дыміць цяпер, ні адна машына ня шуміць цяпер. Забастоўка!

Але жыцьцё кіпіць. Вядзецца бліскуча арганізаваная барацьба. У першыя дні былі дабравольныя штрэйкбрэхэры. А цяпер іх болей няма. Кожныя фабрычныя вароты, кожны ўваход у вёску вартуюцца моцнымі пікетамі і патрулямі бастуючых. Сацыял-дэмакратычныя начальнікі паліцыі паслалі паліцыю проці бастуючых.

Яны правакуюць усюды, але рабочыя навучыліся, як трэба баставаць і як ухіляцца [ад паліцэйскае правакацыі. Калі яны не змаглі сілком устрымаць штрэйкбрэхэраў, яны зьмянілі тактыку. Яны адведвалі кожнага з іх дома і тлумачылі сэнс барацьбы. Цяпер усе бастуюць.

Цьвёрда і цесна стаяць рады рабочае арміі. Яны ведаюць, за што ідзе змаганьне. Жыць горш, чым цяпер, немагчыма. І сымпатыі шырокіх масаў на баку бастуючых. З іншых райёнаў надыходзяць вялікшыя грашовыя сумы дзеля падтрыманьня бастуючых, міжнародная рабочая дапамога і шмат каапэратываў раздаюць харч. Запасы вугольля спалены і цяпер штодзённа зачыняюцца вялікія фабрыкі дзеля адсутнасьці вугольля.

Арганізаваны прамысловы капітал прабуе ўсе спосабы, каб разьбіць адзіны фронт бастуючых. Пашыраюцца аблыжныя весткі, робяцца паліцэйскія атакі і робяцца спробы перагаворамі з правадырамі прафсаюзаў знайсьці хаўрусьнікаў.

Воля да перамогі панае сярод бастуючых. Яны не адмовяцца ад поўнага здаволеньня іх трэбаваньняў.

Таксама ў Рурскай горнай прамысловасьці, дзе працуюць 750000 рабочых, расьце воля да змаганьня. Прадпрыёмцы груба адхілілі трэбаваньні рабочых аб павялічэньні зарплаты.

Яны заявілі, што замест павялічэньня трэба было-б гаварыць аб зьмяншэньні. Гэты грубы адказ ёсьць выклікам на барацьбу. Забастовачны рух у Нямеччыне ўсё пашыраецца. Камуністычная партыя ёсьць кіраўнічаю сілаю ў барацьбе за лепшае жыцьцё.

Макс Пфайфэр.

*) Чытач ужо ведае з зьмешчаных тэлеграм, што забастоўка сарвана рэфармісцкімі правадырамі.

Польскі адміністратар аб беларускіх справах.

Зусім неспадзявана сустракаем мы на шпальтах такога кансэрватыўнага органу, як «Кур'ер Варшаўскі», атрымкул заканспіраванага псэўданімам «Дэ-эс'а» пад назвай: «Наша жыцьцё на крэсах». Цікава ў гэтым артыкуле тое, што закранаецца ў ім жыцьцё сумежнай з намі тэрыторыі Вілейскага павету, і тое, што жыцьцё гэтае абмалёўваецца са слоў сучаснага старасты Вілейскага павету пана Пітаслаўскага.

У сваёй размове з п. Бээсам польскі адміністратар закрануў цэлы шэраг пытаньняў і выказаў на іх свае погляды. Пачаўшы ад палітычных спраў, п. староста перайшоў потым да пытаньня аб беларускім руху, аб стасунку да польскай школы, аб школьных будынках, аб польскіх настаўніках аб асадніках і г. д.

Пан староста «ўважае беларуса за тып, які пры адпаведнай тактыцы можна перарабіць, як хочаш. Мясцовы селянін—спакойны, паслухмяны, спаўняе ўсялякія грамадзкія абавязкі, плаціць падаткі, дае рэкрута, калі няма агітацыі, дык пасылае дзяцей у польскую школу. Адзначаецца толькі рашучай нясымпатыяй і падазронасьцю да паноў, але і гэта можна з часам перарабіць»...

З гэтай старастаўскай характарыстыкі тыпа беларуса мы бачым, што ён зусім адпавядае самым найбольшым вымаганьням адміністрацыі. Тым ня меней п. староста думае, што тып беларуса трэба перарабіць так, каб яму больш падабаліся паны. А мы ведаем, што польская адміністрацыя галоўным чынам і занята тым, каб перарабіць Зах. Беларусь так, каб яна выглядала больш польскай, як сама Польшча. Гэта, зразумела, выклікае з боку беларусаў пратэсты, за якія іх садзяць у вастрог, і наогул—нясымпатыю да Польшчы, бо яна, замест паважаньня і задаволеньня беларускіх патрэб, імкнецца «перарабіць» беларусаў спосабамі досыць дзікімі. Што-ж да паноў, дык спытаемся: а ў іх ёсьць сымпатыі да «хлопаў»? Здаецца, што каб было магчыма, дык паны і цяпер-бы распраўляліся з «быдлам» таксама, як і за панічыну, г.ё. білі-б, секлі-б, садзілі-б у каталажку, зьдзекаваліся-б, як хацелі і г. д. Калі гэтага рабіць цяпер няможна, дык усёроўна, беларускае сялянства бачыць, што польская адміністрацыя знаходзіцца ў хаўрусе з панамі і на кожным кроку эксплёатуе сялян на карысьць паноў розными спосабамі: з сялян здымаюць куды больш грашовых падаткаў, як з паноў, апрача таго, сяляне нясуць розныя натуральныя павіннасьці, як, напрыклад: пастаўляюць падводы, папраўляюць дарогі нават на памешчыцкіх землях і інш. Якая-ж можа быць пасьля гэтага ў нашых заходніх братоў сымпатыя да паноў?

Далей... Па пытаньне п. Бээса: «Ці беларускі рух у Вілейскім павеце моцны»? п. староста адказвае: «Да поўнай ступені моцны. Цяпер існуе т-ва беларускай школы, якое стараецца абуджаць нацыянальнае самапачуцьцё і праводзіць у валасныя рады сваіх людзей. Сяляне атрымліваюць дарма беларускія газэты з антыдзяржаўнай тэндэнцыяй, якія праводзяць сталую акцыю проці ўрадоўца, настаўніка і польскага паліцэйскага. Стараюцца роўным чынам пераканаць беларускі народ, што ў хуткім часе наступіць вялікая зьмена».

«А якія іх адносіны да польскай школы»?

«На вёсцы беларус найчасьцей хоча, каб яго дзеці вучыліся папольску, бо ён добра разумее ўсепрактычныя карысьці, якія адтуль выплываюць. Аднак, часта нацыянальная агітацыя робіць свой уплыў»...

Як быццам, пан староста прызнае, што ў Вілейскім павеце ёсьць «да пэўнай ступені» моцны беларускі рух, які абуджаецца т-вам беларускай школы. Але пасьля гэтага п. староста неспадзявана заяўляе, што беларус хоча, каб яго дзеці вучыліся папольску. Як тут зразумець п. старасту? Хіба, што так: беларусы хочуць вучыцца пабеларуску, але дзеля таго, што беларускай школы не даюць, дык беларусы прымушаны аддаваць сваіх дзяцей у польскія школы.

Як вядома, у Зах. Беларусі ёсьць некалькі школак утраквістычных, дзе вучацца на польскай і беларускай мовах. Вось як адбываецца там навука: «На першым аддзеле нашы дзеці (польскія) павінны сьпяваць пабеларуску, вучыцца пабеларуску рэлігіі і рахункам, і толькі гімнастыка адбываецца папольску».

На якога дзябла выдумалі падобную школу,—староста добра ня ведае, але як-бы ўкосна крытыкуе яе тым, што кажа: «Вынік такой школы той, што цяпер у Вілейцы закладзена прыватная польская школа».

Выходзіць, што польскім дзецям не падабаецца вучыцца на беларускай мове і яны ўцякаюць ад яе, бо маюць магчымасьць вучыцца у сваёй роднай. Дык тады трэба і да беларускіх дзяцей застасаваць той-жа вывад,—што яны хочуць вучыцца на сваёй роднай мове і што навучаньне беларускіх дзяцей па польскай мове зьяўляецца насільствам.

Школьных будынкаў у павеце толькі 13, а трэба пабудаваць яшчэ найменш 500. Тымчасам будуецца толькі адна школа—у Буцлаве і пры гэтым з такою пышнасьцю, што «за гэтыя грошы можна было-б пабудаваць пяць пачатковых школак»,—кажа п. староста.

«Настаўніцкі матар'ял паходзіць пераважна з Галіцыі і рэдка зьяўляецца адпаведным. Рэдка хто з іх умее пабеларуску і таму кантакт з бацькамі вельмі слабы. Настаўніцтва рэдка занімаецца грамадзкімі справамі»...

Урэшце і п. староста прызнаў, што настаўніцкі матар'ял на крэсах нікуды нягодны. Дык трэба было-б іх звольніць і на іх месца пасадзіць беларусаў. Замест гэтага беларускіх настаўнікаў або зусім нікуды не назначаюць, або пасылаюць у Пазнань і іншыя часткі Польшчы, дзе беларусы ня жывуць.

Апошняе пытаньне—аб асадніках. «Шмат чаго можна пажадаць у нашым краі асаднікам. Лядзьва трэцяя частка іх здолела сяк-так загаспадарыць. З імі шмат клопату, бо часта з земляробствам яны зусім незнаёмы».

І тут п. староста сказаў праўду.

З болем у сэрцы не за адабраную ў беларускага селяніна зямлю, а за асадніцкую зямлю, якую яны ня могуць утрымаць за сабою для калёнізацыі Зах. Беларусі, гаворыць і чуць ня плача п. староста. А тут у дадатак да ўсяго—«найгоршая бяда: жэняцца на мясцовых сялянках і беларусізуюцца».

І ў роспачы п. староста знаходзіць паратунак у «падтрыманьні мясцовага польскага элемэнту, а іменна—тых засьценкаў, якія пратрываўшы злыя часы, здолелі аж да апошніх дзён захаваць чыстыя польскія звычаі».

Слабая надзея! На адной засьцянковай шляхце Польшча на ўсходніх крэсах ніколі ня вытрымае.

Трэба, відаць, шукаць паразуменьня з беларускім народам, а не праваказаваць яго і зьдзекавацца.

М. ЛУЧАНІН.

Папскі „калідор".

Дзівочна, а часам і зусім недарэчна выглядае палітычная карта пасьляваеннае Эўропы. Несправядлівасьці старых граніц паміж дзяржавамі, што дзялілі на часткі жывое цела жывых народаў (сэрбаў, украінцаў, палякаў і інш.), зьявіліся адною з галоўных прычынаў выбуху вялікае вайны. Але калі пасьля закančэньня ваенных падзей дыплёматы дзяржаў-пераможніц пачалі перакройваць палітычную карту Эўропы на новы лад, — было пароблена новых несправядлівасьцяў яшчэ больш, чым іх было раней. У сучаснай пасьляваеннай Эўропе тэрытарыяльных спрэчак непараўнана больш, чым у даваеннай, і кожная з іх пагражае выклікаць ваенны пажар у будучыні, калі жудасьці мінулае вайны трохі забудуцца, а сілы ў прэтэндэнтаў на спрэчныя абшары павялічацца. Аднак з найбольшых недарэчнасьцяў пасьляваеннага разьмежаваньня Эўропы зьяўляюцца «калідоры», нацыянальна чужыя абшары, аддадзеныя тым ці іншым дзяржавам. Найбольш вядомы, найболей выклікае напружнасьці ў міжнароднай палітыцы Эўропы Гданскі «калідор», якім вэрсальскія пераможцы перарэзалі Нямеччыну дзеля паданьня Польшчы доступу да мора. Другім «калідорам» зьяўляецца польскі «калідор» праз Заходнюю Беларусь з Польшчы ў краі Прыбалтыкі. Ліквідацыя першага з успомненых „калідораў" зьяўляецца адным з асноўнейшых заданьняў нямецкае палітыкі і задае клопату эўрапейскай дыплёматыі.

Не зважаючы аднак на няўдачную практыку з ужо існуючымі «калідорамі», пачынае падгатаўляцца праэкт яшчэ аднаго, таксама досыць дзівачнага калідору. Праэктуецца ні больш, ні менш, як аднаўленьне сьвецкае ўлады папы і перадача новаўтворанай папскай «дзяржаве» часткі Рыму з ваколіцамі і «калідорным» выхадам да мора. Гаворыцца аб гэтым зусім усурёз, і замежныя газэты шмат пішуць на гэтую тэму. Закранула яе нават і «Правда». У выпадку, калі праэктаваны папскі «калідор» стане рэальнасьцяй, у палітычным жыцьці Эўропы зьявіцца новы важны фактар, з якім трэба будзе наважна лічыцца.

Праэкт утварэньня папскага „калідору" зьяўляецца спробаю вярнуць гісторыю Эўропы на 57 год назад і выклікаць да жыцьця тое, што здавалася даўно і беспаваротна зьліквідаваным, бо сьвецкая ўлада папы ня існуе ўжо ад 20 верасьня 1870 г.

Сьвецкая ўлада папы існавала больш 1000 год. Гэты падарак Караля Вялікага першым прабаваў зьнішчыць Напалеон у маі 1809 г., але пасьля ўпадку Напалеона сьвецкая ўлада папы была ізноў адноўлена, а забраныя ад яго абшары ізноў зьвернуты. Другая проба ліквідацыі сьвецкае ўлады папы была зроблена ў часе рэвалюцыі 1848 г., але пратрывала толькі год, і ў 1849 г. Напалеон III ізноў вярнуў папе яго абшары. У Рыме быў зьмешчаны французкі гарнізон, які павінен быў бараніць «вечнае места» ад нападу з боку Італіі, якая перажывала тагды пару нацыянальнага аб'яднаньня, зьбіраньня ў адно ўсіх італьянскіх земляў. 16-га верасьня 1864 г. ва ўмове з Францыяй італьянскі ўрад забавязаўся ніколі не чапаць папскіх абшараў. Францыя вывела свой гарнізон, а праз два гады (у сьнежні 1866 г.) у варот Рыму зьявіўся Гарыбальдзі з сваімі дабравольцамі. Італьянскі ўрад, датрымоўваючы ўгавору з Францыяй, арыштоўвае Гарыбальдзі, але той уцякае і ладзіць новы паход, які кончыўся перамогаю папскага войска пад Мантанаю ў пачатку лістапада 1867 году. Французкі ўрад працівіўся аб'яднаньню Італіі і захопу Рыму італьянскім войскам, не жадаючы, каб пад бокам у Францыі вырасла новая магутная дзяржава. Але, калі Францыя ўвязалася ў вайну з Нямеччынаю і вайна прыняла некарысны дзеля яе зварот,—італьянскі ўрад выкарыстаў гэты мамант і 20-га верасьня 1870 году генэрал Кадорна пасьля трохгадзіннага бою з папскімі атрадамі заняў Рым. Сьвецкая ўлада папы перастала існаваць. Пій IX у знак пратэсту замкнуўся ў Ватыканскім палацы і пастанавіў, што ні ён, ні яго наступнікі ня будуць мець ніякіх зносінаў з італьянскім урадам і нават ня выйдуць ніколі з Ватыкану. Экстэрытарыяльнасьць Ватыкану была загварантована ўсімі дзяржавамі, і папа мог рабіць па гэтым абшары, што хацеў. Перад брамаю Ватыкану, як па іншых граніцах, была пастаўлена варта: з аднаго боку—італьянскага караля, а напроціў—папская.

57 год Ватыкан зьяўляўся ў адносінах да Італіі каралеўствам у каралеўстве, не падтрымліваючы афіцыяльных зносін з італьянскім урадам. Маючы ўмовы блізка з усімі дзяржавамі сьвету і ўтрымліваючы пры іх сваіх прадстаўнікоў, Ватыкан ня меў умовы з сваім найбліжэйшым суседам у тым-жа самым месьце—з італьянскім урадам. Хаця Ватыкан і ня мае дзяржаўнага абшару, але захаваў урад, у якім ролю міністраў адыгрываюць кардыналы. Ватыкан удзельнічае ў міжнароднай палітыцы, ва ўсіх яе цёмных камбінацыях і інтрыгах.

Пасьля ўсяго сказанага паўстае пытаньне: які сэнс мае аднаўленьне сьвецкае ўлады папы--проба ажывіць тое, што гісторыяй даўно паложана ў труну? Чаму ініцыятыва выходзіць ад фашыстаў?

Папа ня можа выхоозіць з Ватыкану і ня можа наведваць іншыя дзяржавы, бо ў такім разе прыйшлося-бы праяжджаць праз «варожую» італьянскую тэрыторыю, што было-бы нязгодна з закляцьцем Пія IX. А тым часам рэлігійнасьць усюды падае і папскія даходы меншаецца. Ватыкан-жа выключна жыве спэкуляцыяй на людзкой цемнаце—рэлігіі, на зборы сярод каталікоў усяго сьвету, на даходы ад гандлю рэлігійнымі рэчамі. Калі-б папа мог выяжджаць у чужыя краі і прытым не парушаць закляцьця Пія XI, можна было бы папскімі візітамі ў той ці іншы край падагараваць у ім рэлігійнасьць і павялічваць даходы папскае казны.

Такая магчымасьць якраз і адчыняецца праэктуемай перадачай пад «сувэрэнную» ўладу папы калідору да мора. Ясна, што праэкт дзеля папы і Ватыкану выгадны. А на што разьлічае фашызм?

Мусаліні разумее, што фашызм слабее з кожным годам. Пры такіх умовах лепш мець у Ватыкане саюзьніка, чым ворага, тым больш, што ўплыў папы і ксяндзоў на цёмныя народныя масы Італіі ўсё яшчэ даволі вялікі.

Зрабіць з папы саюзьніка фашызму ўнутры Італіі і абаронцу італьянскіх вялікадзяржаўных інтарэсаў на міжнароднай арэне—вось мэта Мусаліні, якую ён думае дасягнуць «калідорам».

Пакуль што справа абмяжоўваецца газэтнымі артыкуламі ў «Оссэрватоpэ Романо» (папскі афіцыёз), «Пополё д' Італія» і «Корр'ерэ дэлля Сэра» (фашыстскія афіцыёзы). Побач з газэтнымі артыкуламі адбываюцца неафіцыяльныя перагаворы, якія пакуль што пасоўваюцца наперад туга.

Калі справа папскага «калідору» будзе вырашана так, як цяпер памячаецца, дык гэта будзе адкрытым саюзам дзьвёх найболей рэакцыйных сілаў сучаснасьці: фашызму і клерыкалізму дзеля супольнае барацьбы з міжнародным пралетарыятам і наогул з працоўнымі масамі.

М. С.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

На будаўніцтва „Чырвонай Бярэзіны".

Барысаў. На сярніковай фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» зараз ужо выведзены сьцены трох карпусоў новай фабрыкі і прыступлена да перакрыцьця саломачнага корпусу.

Па фінансавых меркаваньнях пабудову электрастанцыі пастаноўлена разьбіць на 2 чаргі:—у першую будуць устаноўлены 2 турбагенэратары па 2000 кілёват, з якіх адзін ужо нагружаны ў Нямеччыне; трэці турбагенэратар на 1000 кілёват будзе ўстаноўлен праз пару год. Праэкт электрастанцыі перааапрацоўваецца і ў бліжэйшыя дні будзе перададзен на разгляд адпаведных органаў. Пабудова-ж яе распачнецца вясной у 1928 г., як толькі дазволіць надворʼе.

З пабліжэньнем зімы мулярскія работы па будаўніцтве хутка скончацца, а ўзіму будуць весьціся толькі сталярныя работы.

У сувязі са скарачэньнем імпорту, будаўніцтва «Чырвонай Бярэзіны» крыху можа затрымацца.

Сёлета сярніковая прамысловасьць экспартуе за межы — у Нямеччыну, Францыю, Англію і краіны Блізкага Ўсходу каля 1000000 скрынак запалак на суму да 5000000 р, і таму было-б добра, каб частку гэтых сродкаў адпусьцілі на абсталяваньне «Чырвонай Бярэзіны», якая ў бліжэйшай будучыне зможа даць танны экспортны тавар.

АЖЫЎЛЕНЬНЕ КРАЯЗНАЎЧАЕ ПРАЦЫ.

Барысаў. На пасяджэньні Барысаўскага гарсавету быў [заслухан дакад аб становішчы краязнаўчае працы. Выявілася, што праца заняпала, сэкцыі і гурткі распаліся, няма музэю і бібліятэкі, кіраўніцтва з боку акругавага т-ва адсутнічае. На апашнім сходзе абрана новае праўленьне, якое распачынае арганізацыйную працу і мае на ўвазе заняцца вывучэньнем мясцовай прамысловасьці і быту рабочых. Гарсавет пастанавіў дапамагчы т-ву матар'яльна, адвесьці пакой для мясцовага краязнаўчага музэю і бібліятэкі. Краязнаўчую працу і задачы краязнаўчай арганізацыі неабходна папулярызаваць сярод рабочых.

ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ЛЕСАМ.

Мазыр. Для забясьпечаньня мясцовага насельніцтва і ўстаноў апалам і лясными матар'яламі, Мазырскі АВК прызнаў патрэбным арганізаваць у гарадох: Мазыры, Пятрыкаве і Калінкавічах лясныя склады. Устаноўлена наступная колькасьць драўніны і апалу, патрэбных мясцоваму насяленьню: па Пятрыкоўскаму лясному складу—1500 к. с., па Калінкавіцкаму—1500 к. с. і па Мазырскаму—2000 к. с.

Каб поўнасьцю здаволіць мясцовае насяленьне апалам па даступных цэнах, каб больш пасьпешна весьці барацьбу з самавольнымі лесапарубшчыкамі, пастаноўлена прасіць Эканамічную Нараду БССР аб зьняцьці гандлёвай наддачы на дравяны апал, бо па папярэдніх падліках кошт куб. сажню дроў з гандлёвай наддачай зьяўляецца наздвычайна дарагім.

ДАПАМОГА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Магілеў, 27-X. Прэзыдыум АВК адпусьціў 2.000 р. на рамонт казармаў кавалерыйскай брыгады. 700 р. асыгнаваў на падарункі к сьвяту Кастрычніка байцам № дывізіі і 5000 р. адпушчана Дому Чырвонай арміі.

ПЕРАПІС БЕСПРАЦОЎНЫХ.

Віцебск, 27-X. Пачаўся перапіс беспрацоўных. Перапіс мае на мэце ўстанавіць агульны лік беспрацоўных, выявіць іх прафэсыйны склад і кваліфікацыю, дасьледаваць сацыяльны склад беспрацоўных, устанавіць час беспрацоўя. Апрача таго, перапіс павінен выявіць разьмер матар'яльнай дапамогі, якую аказваюць беспрацоўным саюзы і страхавыя органы.

АДЧЫНЯЮЦЦА С.-ГАСП. ВЫСТАЎКІ.

Барысаў, 26-X. 30 кастрычніка ў Барысаўскім райёне адчыняецца 3 сельска-гаспадарчыя выстаўкі. Падрыхтоўчая праца да выставак ужо скончылася. Чакаецца шмат экспанатаў, малюючых уздым культуры сялянскай гаспадаркі.

СЯЛЯНЕ ПАБУДАВАЛІ ШКОЛУ.

Барысаў, 27-10. Скончылася пабудова будынку для Лозінскай пачатковай 2-хкамплектнай школы. Гэты будынак сяляне будавалі за свае ўласныя сродкі і райвыканком толькі троху дапамог грашыма. Урачыстае адчыненьне адбудзецца ў дні Кастрычнікава сьвята.

НОВАЯ БОЛЬНІЦА

Зембін, 27-10. Ужо ідзе к канцу праца па пабудове новай больніцы. Будуецца яна за сродкі мясцовага бюджэту і да дзён сьвяткаваньня юбілею будзе ня толькі пабудавана, але і досыць добра абсталявана.

РОСТ КААПЭРАЦЫІ.

Дрыса, 26-X. Па райёну каапэравана 57,5 проц. сельскіх гаспадарак, якія абслугоўваюць 13 крам спажывецкай каапэрацыі. Паявы капітал складае 9.320 руб., лік пайнікаў вырас да 3.000 чал. Беднаты за год каапэравана на льготных умовах 626 гаспадарак.

Новы праэкт спрашчэньня землеўпарадкаўчага працэсу.

Пасьля цяжкіх мучэньняў, са сьцен Аддзелу Землеўпарадкаваньня вышаў праэкт спрашчэньня землеўпарадкаўчага працэсу, які разаслалі ў акругі на заключэньне.

Галоўны недахоп прапануемага працэсу ў тым, што ён не закранае зусім пытаньня аб аб'яднаньні дзьвёх існуючых устаноў, з якіх кожная займаецца пытаньнямі кіраўніцтва землеўпарадкаваньнем—гэта зямельныя камісіі і так званыя землеўпарадкаўчыя ўстановы. Без аб'яднаньня гэтых устаноў у адну мы не дасягнем ніколі запраўднага спрашчэньня землеўпарадкаўчага працэсу. Заўсёды будзе „хожденне по мукам" землеўпарадкаўчай справы, заўсёды будзе дзьве нянькі, пры наяўнасьці якіх дзіцяці ніколі соладка ня бывае.

Што ўяўляюць сабой абедзьве названыя ўстановы ў даны момант?

Пры Наркамземе ёсьць Асобая Калегія Вышэйшага Кантролю (судова-зямельная ўстанова) і Аддзел Землеўпарадкаваньня (землеўпарадкаўчая ўстанова). На практыцы фактычна іх функцыі падзяляюцца наступным парадкам: Аддзел Землеўпарадкаваньня кіруе тэхнікай выканаьня работ і іх фінансаваньнем, а АКВК—кіруе прававым моментам і моментам гаспадарчай мэтазгоднасьці складаемых праэктаў. Праўда, звычайна на пасяджэньні АКВК, пры разглядзе справы па землеўпарадкаваньню, прысутнічае прадстаўнік ад мэліязему, але гэта бывае не заўсёды, дый ці-ж гэтым дасягаецца адзінае кіраўніцтва?! Гэта-ж толькі „пагоджанасьць".

Пры акрэсмаддзелах ёсьць зямельныя камісіі і акруговыя землеўпарадчыкі.

Там большая „сувязь" у рабоце, але-ж і часьцей бывае „неразьбярыха". Часта ня толькі сяляне, якія зацікаўлены па таму ці іншаму пыта

ФЭЛЬЕТОН.

Таварышы наркамземаўцы, дазвольце падыскусаваць.

Выбачайце, шаноўныя грамадзяне наркамземаўцы, але я з вамі ня згодзен. Не таму, што ў мяне натура такая ўжо западта апазіцыйная. Не. Проста таму, што я, як зацікаўленая ў даным пытаньні асоба, вымагаю яснасьці і канкрэтнасьці. Справа ідзе аб выдадзеных вамі правілах паляваньня. У гэтых правілах ёсьць, напэршае, некаторыя няяснасьці, а падругое, такія пункты, супроць якіх мая душа, як запраўднага і датаго-ж, загартаванага паляўнічага, горача пратэстуе.

Пачнём спачатку.

„Правілы вытвару паляваньня на тэрыторыі Беларусі, аб яе тэрмінах і спосабах".

Тут відочная няяснасьць, бо незразумела аб чыіх тэрмінах і спосабах ідзе гутарка—тэрыторыі ці Беларусі. Калі тэрыторыі, дык чаму, дазвольце, не Беларусі, а калі Беларусі, дык чаму не тэрыторыі?

Далей.

„Агульныя палажэньні. Артыкул 1.—Дзікія зьверы і птушкі, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, зьяўляюцца ўласнасьцю рэспублікі і правільнае іх скарыстаньне складае адну з галузяў дзяржаўнае гаспадаркі Беларусі".

Тут я павінен зазначыць, што вашы заходы ў кірунку дзяржаўнае гаспадаркі ня маюць над сабою ніякага грунту. Праўда, наша гаспадарка яшчэ ня вельмі багатая, але ўсё-ж такі відочна расьце і ваш східны нанёк пакоп нейкіх злоякасных галузяў тут якраз не адпавядае запраўднасьці.

Далей.

„Тэрміны і спосабы паляваньня. Арт. 9. Забараняецца:

б) вытвор паляваньня агульна небясьпечнымі спосабамі, як, напрыклад: настаражываньне стрэльбаў і самастрэлаў, пусканьне палаў...

в) ужываньне прыладаў і спосабаў масавага дабываньня зьвераў і птушак, як, напрыклад: ваганіваньне на шэрані...

г)... а роўна выкапваньне зьвераў і раўнаваньне іх лёжаў...

д) дабываньне зьвераў і птушак прыладамі, якія давяць, альбо пагражуць, як, напрыклад... начыньнямі, залезнымі слонцамі, а таксама скрадам пры дапамозе кабылкі, альбо шчыту".

З гэтымі забаронамі я, асьмелюся заявіць, ня зусім згодзен. Што датычыць «настаражываньня стрэльбаў і самастрэлаў», «пусканьня палаў», «ваганіваньня на шэрані» і «раўнаваньня лёжаў»,—дык нічога з гэтага я рабіць ня буду, бо, шчыра сазнаюся, — не разумею ў чым справа. Таксама я згодзен з забаронай «скраду пры дапамозе кабылкі», — няпрыгожая гэта рэч.

А вось што датычыць «дабываньня зьвераў і птушак начыньнямі», дык тут даруйце—ня згодзен. Чым, напрыклад, дрэнны спосаб, калі скажам, дзядзька пойдзе ў лес са сталярным начыньнем, зловіць зайца ды гэблем яго на хвасту? Які тут праступак проці рэспублікі?

Альбо, напрыклад, цётка, едучы з кірмашу дамоў, спаткае ваўка, ды замест таго, каб атукаць,—надзене яму на галаву жбанок і прывядзе ў вёску на пацеху дзяцей? Не задавіць, будзьце спакойны.

А калі ўрэшце гаспадыня палонікам падчэпіць каўку ды адразу шасьне яе ў крупнік. Думаеце напсуе? Нічагуткі.

І вось, бачачы ўсю прастату і лёгкасьць дабываньня зьвераў і птушак начыньнем, я, канешна, рашуча ня згодзен з гэтай забаронай і пратэстую.

Цяпер пераходзім да пунктаў, якія дазваляюць паляваньне. Арт. 10-ты кажа:

«Паляваньне дапушчаецца: а) на драпежных зьвераў і птушак: ваўка, рысь, бродзячых сабак і кошак, сусьлікаў, шашкоў, а таксама шкодных птушак і арла, крагуёка, варонаў і сарокаў у адчынены для паляваньня час законным спосабам і ў зачынены ўсялякімі спосабамі... і г. д.».

З гэтым пунктам я цалкам ня згодзен. І вось чаму. Нам дакладна вядома, што нават у старых рэакцыйных падручніках для пачатковых школ і ў тых воўк і рысь лічыліся зьвярамі, а ня птушкамі, а таксама ніколі ня лічыўся птушкай шашок, сусьлік. Зноў-жа, калі ня мыляюся, па сёньнешні дзень ня было ніякае навуковае пастановы адносна пераводу сусьлікаў у групу драпежных зьвераў ці птушак. Вось толькі, што датычыць крагуёка, дык я тут нічога канкрэтнага не магу сказаць, бо колькі я ні капаўся ў розных падручніках і нават навуковых кніжках, такой жывёліны нідзе не знайшоў і ня ведаю, чым яна абрастае, пер'ем, ці поўсьцю і ў які час яе можна біць—у адчынены, ці наадварот, у зачынены.

Пераходзім далей да 13-га артыкулу, які, на мой погляд, патрабуе найбольшае яснасьці. Гэты артыкул пераконвае, што

„безгаспадарчыя сабакі і кошкі, звычайна лётаючыя па ўгодзьдзям, прылічваюцца да шкодных жывёлін і павінны зьнішчацца на працягу ўсяго году.

Увага: Усе сабакі, якія лётаюць паза двярамі без намыльнікаў, падлягаюць зьнішчэньню пры ўсялякіх умовах усімі спосабамі, за выключэньнем ядоў, як агульна небясьпечнага".

Тут, таварышы наркамземіцаўцы, дазвольце заўважыць, што вас нейкі паляўнічы злосна абманыў. Усе паляўнічыя, як вядома, страшэнныя манюкі і хвалькі і калі хто-небудзь з іх казаў вам, што бачыў лётаючага сабаку, або кошку, дык тут ён яўна хваліўся. Бо ў гэтым я сам пераканаўся. Надоечы я спэцыяльна наглядаў, як гіцлі па Савецкай вуліцы лавілі «безгаспадарчых» сабак. Прэ гіцаль з нейкай доўгай пугай з пятлёй на канцы, аж язык вылупіў. Прэ і сабака на ўсе лапаткі. Вось, вось насьцігае яе гіцаль,—тут бы, здаецца, самая пара сабаку ўзьняцца і паляцець, а з гары гіцлю дулю паказаць: «што злавіў». І што-ж вы думаеце, так і не паляцеў, бядак,—злавіў яго гіцаль.

А ўчора я за кошкай наглядаў. Ходзіць па суседавай страсе, вусамі паводзе, хвост трубой,—відочна бесгаспадарчая. Узяў я камень, размахнуўся і шмарганў у кошку: «няўжо думаю паляціц»? Дык не, не паляцела, сьцерва. Скочула на зямлю, ды па гародзе як папрэ, толькі пыл курыць. А вы кажаце—лётае...

Патрабуе некаторай яснасьці і артыкул 14-ты, які кажа:

„Сабакі паляўнічае народы ў недазволены для паляваньня час павінны затрымлівацца і дастаўляцца ў бліжэйшую арганізацыю, якая пры вядомасьці ўласьніка зварочае сабаку апошняму пры адцлаце каштоўнасьці яе ўтрыманьня".

Пра якую арганізацыю ідзе гутарка,—грамадзкую, ці наадварот? Гэта ня высьветлена, і сабаку я магу прывесьці ліха ведае куды...

Нарэшце, артыкул 19-ты, на мойму, таксама вельмі туманны. Пункт г) тлумачыць:

„Нагляд за захаваньнем правілаў аб паляўнічых запаведніках, а роўна ўзбуджэньне крымінальнага пераследаваньня і абвінавачаньня перад судом вінаватых ускладаецца нараду з органамі ўлады на адміністрацыю запаведнікаў і сяброў саюзу паляўнічых".

Тут я ня згоднзен з „узбуджэньнем крымінальнага пераследаваньня і абвінавачаньня перад судом вінаватых, узложнага нараду з органамі". Гэта, згадзіцеся самі, неяк крыху нялоўка.

Вось тыя пункты правілаў паляваньня, з якімі я, таварышы наркамземаўцы, ня згодзен і якія, намойму, патрабуюць шырокага абгаварэньня для больш дакладнага высьвятленьня.

Асабліва, на мой погляд, патрабуе належнае дыскусіі пункт аб лётаючых сабак і кошках. Як з імі ўрэшце быць? Страляць іх на ляту, ці на бягу?

Дазвольце, таварышы наркамземаўцы, падыскусаваць на гэтаму пытаньню.

ЛЕАНІД СВЭН.

На варце краіны Саветаў.

На абарону краіны.

Цэнтральны Савет ТДА-Авіяхіму Беларусі пачаў сваю працу з мая м-ца 1927 г.; к гэтаму часу адбылося канчатковае злучэньне арганізацыі Авіяхіму і ТДА на мясцох. На 1-е верасьня г. г. (па ня зусім яшчэ поўных дадзеных) па БССР налічваецца 1.808 ячэек ТДА-Авіяхіму, з іх вытворчых масцца—246, вайсковых—176, сялянскіх—697, савецкіх—541, школьных—148. Усе ячэйкі аб'яднаюць—87.305 сяброў, з іх мужчын—72,755 і жанчын—14,550. Найбольш значную групу ў арганізацыі складаюць рабочыя (30,7 проц. агульнага ліку), затым ідуць служачыя (26,3 проц.) і ваенныя (18 проц.); найменшы процант падае на сялян (16,4 проц.) і вучняў (8,6 проц.). Вялікае месца ў працы ТДА-Авіяхіму Беларусі ў часе яго дзейнасьці займаў «Тыдзень абароны». Гэта кампанія была праведзена арганізована і плянава. У часе кампаніі была праведзена вялікая праца, у выніку чаго мы маем наступныя дасягненьні. Напэршае, завострана ўвага мас вакол пытаньняў абароны краіны, ваенізацыі працоўнага насельніцтва, таксама ўзрос аўтарытэт ТДА-Авіяхіму. Падругое, у кампанію «Тыдню абароны» ўступіла ў лік сяброў ТДА-Авіяхіму—16,459 чал., арганізавана 115 новых ячэек, 195 гурткоў, пабудавана 59 ціраў. Патрэцяе, сабрана сродкаў, па лініі ТДА-Авіяхіму ў фонд абароны 45,591 руб. На 1-га верасьня г.г. налічваецца 943 гурткі, з іх стралковых—518, гурткоў вайсковых ведаў—332 і галубіных станцый—2. Першае месца займаюць стралковыя гурткі і і другое—гурткі вайсковых ведаў.

Удзел сяброў ТДА-Авіяхіму ў апошніх манэўрах Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі таксама быў праведзен досыць арганізована. Наогул трэба сказаць, што за апошні час праца ТДА-Авіяхіму, як на мясцох, так і ў цэнтры, значна ажывілася і арганізацыя стала на цьвёрды грунт.

М. А.

Вучымся ўладаць вінтоўкаю.

Заснаваны 4 месяцы таму назад «цір» Наркамзема даў свае вынікі.

Гурток вайсковых ведаў з агульнага ліку 400 служачых прывабіў да сябе —120 чал. Вывучаюць яны стральбу на 2-х вінтоўках падшэфнага палка Д. П. У.

Зацікаўленасьць да гэтае справы вялікая.

Санітарны гурток (15 жанчын) вядзе заняткі—пад кіраўніцтвам урача Чырв. Крыжу—1 раз у тыдзень па 2 гадзіны.

Падшэфная частка таксама 1 раз у тыдзень (2-3 гадзіны) выкладае наркамземаўцам тэорыю вайсковае справы, практычную разборку частак баявога аружжа і прыёмы стральбы.

Даклады на вайскавыя тэмы па чарговых сходах служачых праводзяцца рэгулярна спэцыялістамі з ТДА.

Урэшце трэба падкрэсьліць, што ў зьвязку з наступам зімовага часу пасьнела пытаньне яжнайхутчэй заведці належна абсталяванае памяшканьне.

Там наркамземаўцы яшчэ мацней разгорнуць вывучэньне,—як уладаць вінтоўкаю і наогул усіх тыпаў ваенізацыі.

К. Н.

На „пункце замярзаньня".

Заснаваны тры месяцы таму назад агульны «цір» пры чатырох менскіх скурзаводах прывабіў да 40 сяброў (усяго рабочых—400 чал.).

Нажаль, набытыя вінтоўкі замежнага ўзору... І таму, сярод рабочых нічога, апроч гумарыстычных насьмешак ня выклікаюць.

Усіх гурткоў вайсковых ведаў пры скурзаводах—4. Агульны лік сяброў у іх—170.

Гурткі ўтвораны гэткія: а) паветранага нагляду, б) абслугоўваючага парадку, в) санітарны і г) вайсковы.

Інтэнсыўнасьць працы існуючыя гурткі не адзначаюцца. Не хапае ў іх энэргіі і творчага духу. «Працуюць» больш па словах і паперы.

Падшэфная частка яшчэ не праводзіць заняткаў.

На тым-жа «пункце замярзаньня» знаходзяцца і даклады на вайсковыя тэмы на чарговых сходах.

Скурнікам трэба вельмі і вельмі падцягнуцца!

М. К.

„Трымайце моцна стрэльбу ў руках".

(№ Чырвонаштандарны полк).

Клюб повен. Сярод чырвонаармейцаў мітусяцца чырвоныя хусткі і чорныя кепкі—гэта прадстаўнікі ад прадпрыемстваў г. П.-Барысава.

№ Чырвонаштандарны полк сабраўся сёньня сюды праводзіць сваіх таварышоў адпускнікоў.

— Наш полк,—кажа камандзір палка т. Скугараў, які мае вялікія заслугі, стаіць не апошнім і ў баявой вывучцы, аб гэтым сьведчаць посьпехі палка на сёлетніх манэўрах. Кампаліт-склад нашага палка спадзяецца, што вы і на кёсцы будзеце актыўна працаваць, як і ў палку. Вы, як малодшы камскład, які мае вайсковыя веды, пасунеце значна ўперад ваенізацыю насельніцтва. Але, праводзячы працу дома, вы павінны памятаць, што вы пакідаеце нас не на заўсёды. А дзеля гэтага трэба трымаць сувязь з палком.

Гучныя воплескі.

У часе пасяджэньня быў зачытан маніфэст. Чырвонаармейцы слухалі маніфэст з надзвычайнай уважлівасьцю.

Слова мае адпускнік Варгалаў.

— Дазвольце мне ад імя адпускнікоў упоўніць склад палка, што тыя надзеі, якія вы ўскладаеце на нас, мы выканаем. Тыя веды, якія мы атрымалі ў палку, панясём у гушчу насельніцтва. Маладым-жа курсантам мы даём наказ: «Трымайце моцна стрэльбу ў руках і папаўнійце свае веды». Калі-ж сусьветная буржуазея ўцягне нас у вайну,—кажа т. Варгалаў,—дык мы зноў зьявімся ў полк пад чырвоны штандар і разам пойдзем у апошні бой.

Гучнае «ура» ўсяго сходу было адказам на словы адпускніка Варгалава.

Ч.

Пераменьнікі—на першым месцы.

(В. Лошніца, Барысаўскага р.).

Па Барысаўскаму райёну справа па ваенізацыі пастаўлена добра ў вёсцы Лошніцы. У вёсцы ёсьць два асноўных гурткі авіяхімаўцаў у складзе 30 чал. і санітарны—у складзе 60 жанчын. ТДА-авіяхімаўскім гурткам кіруе сэкратар парт'ячэйкі, а санітарным—фэльчар. Гурткі працуюць рэгулярна, і сябры ахвотна наведваюць заняткі.

Пры вайсковым кутку маюцца дзьве стрэльбы, з іх адна дробна-калібравая, процігаз і вайсковая бібліятэчка—кніжак 50-55. Акрамя гэтага, маецца спартыўны гарадок і цір. Наогул, ёсьць усе неабходнае дзеля занятак. Чым гэта тлумачыцца, што ў Лошніцы вайсковая справа пастаўлена добра, а ў другіх вёскіх дрэнна? Намойму, тым, што лошніцкія пераменьнікі ня сьпяць, прыйшоўшы са збору, а пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі актыўна ўзяліся за работу.

Зімовы перыяд толькі пачынаецца. Вечары доўгія, ды і часу ў моладзі шмат. Гэты час і трэба скарыстаць на разгортваньне справы ваенізацыі ў іншых вёсках, дзе маюцца пераменьнікі.

Вайскор.

Пераменьнікі чакаюць дапамогі.

(В. Багушэвічы, Бярэзінскага р.).

Калісь-та наша вёска Багушэвічы па сваёй працы была першай у райёне, а ў некаторых адносінах ня ўступала нават і райённаму цэнтру Бярэзіна. Цяпер мы пачынаем пляцціся амаль што ў хвасьце. Чым-жа гэта тлумачыцца? А тлумачыцца гэта тым, што мала праяўляюць ініцыятывы нашы партыйныя і савецкія арганізацыі. Напрыклад, цяпер у цэнтры ўвагі па ўсёй краіне—гэта ваенізацыя, а на яе ў нас мала зварачваецца ўвагі з боку ячэек.

Праўда, вайсковы гурток пры хаце-чытальні ёсьць, які налічвае 20 сяброў, але працуе слаба. Раней саўсім не працаваў, і толькі з прыходам пераменьнікаў праца ў ім трохі ажыла. Але ячэйкі глядзяць на гэта скрозь пальцы і маўчаць замест дапамогі.

Умовы-ж дзеля разгортваньня працы ёсьць: ёсьць добрая хата-чытальня, ёсьць ахвота ў моладзі да вайсковай справы, ёсьць і добрыя вайсковыя кіраўнікі. Але толькі не хапае кіраўніцтва і дапамогі з боку партыйнай камсамольскай ячэйкі.

Ячэйкі павінны дапамагчы пераменьнікам наладзіць вайсковую справу і не абмяжоўвацца толькі 20 членамі, а ўцягнуць у гэтую зіму ўсю моладзь у працу гуртка.

Селькор

Да Кастрычніка пабудуем цір.

Сьвядомасьць працоўнага насельніцтва Смалявіцкага райёну ў пытаньнях абароны краіны значна ўзрасла. Праведзена было шмат сходаў, на якіх насельніцтва ў шэрагу прынятых рэзалюцый выказвае абурэньне супроць буржуазсі і абяцае паўстаць на абарону заваёў Кастрычнікавай рэвалюцыі (Смалявічы, Жодзіна, Верхмень, Ліса, Юрава ды інш.). Кампанія па збору сродкаў у фонд «Нам адказ Чэмберлену» дала 152 р. 54 кап., ад лётарэі і іншых збораў паступіла 28 р. 74 кап. Міжсаюзная арганізацыя адлічыла паўдзённы заработак, што дае 225 р. 40 к. Трэба адзначыць сьвядомасьць і шчырасьць каапэрацыі райёну, якая адлічыла ў фонд 150 руб. Усяго паступае ў фонд 550 руб.

Некаторыя ячэйкі КПБ прымалі слабы ўдзел у правядзеньні кампаніі, як Азярыцка-Слабадзкая і інш. Дзякуючы інэртнасьці некаторых ячэек і селькамісій амаль палова буйных насельных пунктаў засталося не ахопленымі кампаніяй.

Патрэбна райсавету зьвярнуць на гэта ўвагу і даручыць гэтым адсталым мясцом працягнуць кампанію па збору сродкаў, што дасьць досыць багатыя вынікі.

За час кампаніі ўзрасла колькасьць ячэек ТДА-Авіяхіму на 8 з агульнай колькасьцю членаў 126. Ячэйкі праводзяць сходы дзеля папулярызацыі ідэй ТДА-Авіяхіму і ўцягненьня новых членаў.

Заснован амаль у кожным с.-савеце гурток вайсковых ведаў. Уваходзяць у гурток камсамольцы і партыйцы з невялікім удзелам беспартыйнай моладзі, на што трэба зьвярнуць вялікую ўвагу і ўцягнуць паболь беспартыйнай моладзі. На гурткавых занятках вывучаецца вінтоўка, вучацца страляць з яе, адбываюцца розныя тактычныя заняткі, чытаньне вайсковай літаратуры.

Да часу Кастрычнікавай рэвалюцыі мяркуецца пабудова ціру ў мястэчку Смалявічах.

Селькор.

Напярэдадні адчыненьня зьезду прафсаюзаў.

Яшчэ зранку аўтабусы развозілі па гасьцініцах дэлегатаў, прыехаўшых на Ўсебеларускі Зьезд Прафсаюзаў. У Менск прыехалі лепшыя прадстаўнікі працоўных Беларусі, каб агульнымі сіламі абгаварыць шэраг пытаньняў, маючых сувязь з разьвіцьцём нашае гаспадаркі, а таксама і пытаньняў чыста прафэсыйнага парадку.

Пачынаеш гутарыць з дэлегатам на тую ці іншую тэму, але ён праз паўхвіліны пераводзіць гутарку аб працы, якую прыдзецца правесьці ўсебеларускаму зьезду прафсаюзаў...

А другой гадзіне дню ў пакоі ЦСПСБ, дзе працуе часовая мандатная камісія, поўна дэлегатаў: зарэгістравана ўжо звыш 200 чалавек, і яны ўсё прыбываюць.

З розных куткоў Беларусі сустракаюцца знаёмыя па старой працы, дзеляцца дасягненьнямі ва ўсіх галінах савецкага будаўніцтва за тыя некалькі год, у якія яны ня бачыліся.

— Так, браток, куды ні павернешся, усюды бачыш, як мы расьцём не па днёх, а па гадзінах,—кажа рабочы з Віцебску свайму знаёмаму з Полаччыны.

— Вось хутка дажывём і да 7-хгадзіннага рабочага дню,—адказвае палаччанін.

— Шмат працы праароблена, ня менш яшчэ трэба прарабіць, але агульнымі сіламі хутка прыдзем да сацыялізму,—гаворыць адзін з дэлегатаў.

Настрой дэлегатаў дзелавы, усё гаворыць за тое, што праца зьезду пройдзе з посьпехам.

В. Зайцаў.

Вёска сёньня.

Да „Дню ўраджаю" падрыхтаваліся.

30 кастрычніка ў трох пунктах нашага райёну адчыняюцца сельска-гаспадарчыя выстаўкі, на якіх будуць прадстаўлены ўсе галіны сельскай гаспадаркі, за выключэньнем жывёлаводзтва.

На мясцох выставачныя камісіі своячасова распачалі працу, і сялянства як ніколі рыхтуецца прыняць удзел у надыходзячым сьвяце «Ураджаю».

У выстаўцы прымаюць удзел сваімі экспанатамі сельска-гаспадарчыя гурткі райёну, прымае ў ёй удзел і Стара-Барысаўскі сельска-гаспадарчы тэхнікум. Паміж іншым, апошні ў Лошніцах, дзе будзе адбывацца адна з выставак, правядзе паказальную ўспашку 2-мя трактарамі.

У нас выставак аграпэрсанал рыхтуе правесьці аграсуды на розныя тэмы.

Трэба сказаць, што да «Дню ўраджаю» рыхтуюцца ня толькі сяляне, але і шэфы:—шэф'ячэйкі «Домбаля», «Чырвонай Бярэзіны», «Камітэрн» і «Прафінтэрн» рыхтуюць падарункі: веялкі, плугі і іншыя сельска-гаспадарчыя прылады. Райвыканкомам асигнавана 300 руб. на выдачу прэмій за лепшыя экспанаты. У заключэньне скажам, што падрыхтоўка праведзена досыць добра і ёсьць надзея, што выстаўка пройдзе з посьпехам і зьявіцца штыргачом для яшчэ большага пашырэньня культуры ў нашай вясковай гаспадарцы.

В. З.

Барысаўскі райён.

Падатак здадзен своячасова.

9-10 кастрычніка адбыўся пашыраны пленум РВК з удзелам старшынь і сакрэтароў с-с. Старшыні с-с у гэты дзень здалі сельска-гаспадарчага падатку 2598 р. 72 к. і на далейшае вынесьлі пастанову выконваць падатак своячасова, у тэрміны. У канцы пленуму пасьля інфармацыі аб пазыцы індустрыялізацыі падпісалася на пазыку 27 асоб.

В. Рыбцоў.

Чэрыкаў, Магілеўшчына.

Трэба ажывіць працу камісіяў.

Пагосцкі с.-с. абслугоўвае райён з 24 насяленымі пунктамі. З часу перавыбараў адбылося 9 пленумаў с.-с. На гэтых пленумах, а таксама і на пасяджэньнях прэзыдыуму заслухоўваліся справаздачы школ сельска-гаспадарчага таварыства мясцовага аддзяленьня спажывецкага т-ва, пажарнай дружыны і г. д.

Адгэтуль відаць, што с.-с. прымаў актыўны ўдзел у гаспадарчым і культурным жыцьці свайго райёну. З недахватаў трэба адзначыць слабую працу камісіяў: культурная і каапэрацыйная камісія зусім не працавалі. Зараз с.-с. прымае захады да ажыўленьня працы камісіяў шляхам абнаўленьня іх складу. Трэба чакаць, што ўвосень праца камісіяў палепшыцца.

Н. Д.

М-ка Пагост, Бярэзінскага райёну, Менскай акругі.

Прыкладны камітэт.

У гады голаду і недароду ў 1922 г. у вёсцы Азяраны арганізаваўся камітэт сялянскае ўзаемадапамогі. За гэты час ён узмацніўся і ўзрос, будуючы сапраўды культурна-гаспадарчае жыцьцё вёскі. КСУ пабудаваў новую школу, у якой навучаецца цяпер 130 сялянскіх дзяцей,—гэта быў 1924 год. Далей дзейнасьць яго пашыраецца: ён прадае стары будынак школы на злом і купляе паравы млын, які за два гады даў прыбытку 400 рублёў грашыма і 400 пуд. рознага збожжа.

У гэтым годзе прыроблена цыркулярка для расьпілоўкі дашчок, якая дала значны прыбытак нават і ўлетку, калі мліва зусім мала, цяпер намечана купіць крупадзёрку, што і выканаецца к 10-цігодзьдзю Кастрычнікавай рэвалюцыі. Набыцьцё крупадзёркі яшчэ больш узмацніць матар'яльную базу КСУ, што дае надзею да 11-годзьдзя Кастрычніка прыбудаваць дынама-машыну і пусьціць электрыку ў кожную сялянскую хату.

Калі прыглядзецца да працы КСУ, то заўважым, што ў апошнія часы арганізацыйная праца стала кульгаць з-за адсутнасьці платнага працаўніка па канцэлярыі і рахункаводзтву.

Маемасьць КСУ за 5 год будаўніцтва складае 4000 руб.

Я. М. Савіцкі.

В В.-Крушынаўка, Рагачэўскага р., Бабруйшчына.

НАША КААПЭРАЦЫЯ.

На крэпкіх нагах.

Калі параўнаць становішча саматужна-прамысловай каапэрацыі Бабруйшчыны год-два таму назад з яе цяперашнім становішчам, мы пабачым вялікія дасягненьні як колькасьныя, так і якасныя. Цяперака саматужна-прамысловая каапэрацыя мае 48 арцеляў і 12 пазыковаашчадных таварыстваў, летась арцеляў было толькі 36 і пазыкова-ашчадных таварыстваў—9. Цяперака 628 чалавек аб'яднана арцелямі і 3528 пазыковаашчаднымі таварыствамі. Супроць мінулага году ў арцелях зазначаецца павялічэньне колькаснага складу на 41 проц. і ў пазыкова-ашчадных таварыствах—на 40 проц.

Характэрна тое, што гэты год адзначаўся некатораю цягаю жанчын у саматужна-прамысловую каапэрацыю. 19 жанчын-саматужніц каапэравана за прайшоўшы год.

Вось некаторыя зьвесткі аб колькасным стане саматужна-прамысловай каапэрацыі Бабруйшчыны. Цяпер слова аб якасным стане.

За прайшоўшы год закуплена сыравіны на 773874 руб. выпрацавана вырабаў на 663528 руб., Тутака ёсьць значнае павялічэньне супроць ранейшых гадоў. Наладзілася здавальненьне сыравінаю арцеляў праз саюз; праз яго-ж у большай частцы рэалізуюцца і вырабы. Для жанчын, арганізаваных у арцелі, ёсьць панчошныя майстэрні. У Глуску працуе арцель па выпрацоўцы палотнаў для рашот.

Праведзена зьніжэньне цэн на прадукцыю, якую выпрацоўваюць арцелі ў сярэднім на 8 проц. і на прадукцыю лесаапрацоўчую на 15 проц.

Наогуль арганізацыя крэпка стаіць на нагах.

А. Дамброўскі.

Бабруйшчына.

Розьнічныя цэны зьніжаюцца.

Сэкцыяй Барысаўскага гарсавету праведзена абсьледваньне каапэрацыйных устаноў у напрамку зьніжэньня розьнічных цэн. Цэны ў сярэднім да апошняга часу зьніжаны на 12 проц. Вывялася, што цэны ў ЦРК ніжэй, чым у прыгародным таварыстве, што вызывае некаторыя непаразуменьні ў сялян пры закупцы адных і тых жа тавараў у ЦРК і ў крамах прыгароднага т-ва. Гарсавет вынес пастанову аб зьліяньні функцый ЦРК і прыгароднага таварыства ў горадзе і адначасна дало заданьне дасканальна вывучыць пытаньне аб далейшым зьніжэньні цэн.

В.

Барысаў.

Такія „парадкі" трэба зьнішчыць.

Часта можна пачуць сярод пайніка ЦРК нездаваленьне парадкамі, якія існуюць у універсальным магазыне. Шмат хто нагаварвае аб тым, што трэба назабіраць свае паі з ЦРК. У чым-жа тут прычына?

Прычына гэтаму вось якая.

У нас цяпер адчуваецца значны недахват у такіх матар'ялах, як сукно, мультан і інш. Аб тым, калі яны ёсьць у магазыне, можна даведацца толькі тады, калі яны раздадзены. Асабліва дрэнна прыходзіцца тым пайнікам, якія жывуць на акраінах гораду, або працуюць раніцаю ва ўстановах і ня могуць нікога пасылаць у магазын кожны дзень. Паведамленьне аб тым, калі прыбывае такая крамніна, наш ЦРК не дадумаўся вывешваць, і ня ўсе пайнікі аб гэтым ведаюць. Таксама не дадумаўся ён у ўстанаўленьні якой-небудзь чаргі сярод пайнікаў для атрыманьня тавараў. Апрача таго, выдаюць іх толькі раніцою, а пасьля абеду іх ужо няма. Бываюць выпадкі і такія, што запытаем у у касіра, калі будзе крамніна, а ён адказвае, што праз дні два-тры. Пасьля-ж пачуем ад другіх пайнікаў, што выдавалі яе на другі дзень раніцою. Усё гэта выклікае думку ў пайнікаў, што гэтая крамніна выдаецца толькі добрым знаёмым, а іншым яе няма. На гэтую думку накіроўваюць і такія здарэньні. Стала адна настаўніца ў чарзе за палатном для бялізны. Калі дахадзіла чарга да яе, то касір сказаў, што больш ён выпісваць ня будзе. Яна ўсё-ж такі падышла да яго і пачала прасіць, каб выпісаў. Той адмовіўся. У гэты час падышоў начальнік штабу з жонкаю, якая таксама стаяла ў чарзе. Касір зараз-жа пачаў выпісваць матэрыю. Калі настаўніца стала пратэставаць, то касір адказаў, што гэта вайсковы і яму трэба выдаць. Мне здаецца, што пайнікі ўсе маюць аднолькавыя правы ў атрыманьні крамніны і перавагі адзін перад другім не павінны мець.

Гэтыя недарэчнасьці выклікаюць вялікае нездаволеньне сярод пайнікаў. Трэба ЦРК зьвярнуць на гэта ўвагу, а то ён можа пазбавіцца часткі сваіх пайнікаў.

Пайнік.

Слуцак.

Усеагульнае навучаньне ў БССР*).

УДЗЕЛ СЯЛЯН У ШКОЛЬНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Дапамога сялянства ў школьным будаўніцтве выяўлялася, галоўным чынам, у дармовай вырубцы і вывазцы лесу, падвозцы іншых будаўнічых матар'ялаў. У некаторых акругах сялянне будуюць няплянавыя будынкі для школ у досыць значным ліку; так, пабудавана сялянамі, з дапамогай раённых выканаўчых камітэтаў: у Калінінскай акрузе 30 камплектаў, у Слуцкай—41 камплект, у Мазырскай—15, у Рэчыцкай—14, у Менскай—30. Але ў апошнія часы наглядаюцца ў некаторых мясцох і адваротныя зьявішчы: сяляне адмаўляюцца ад выкананьня зробленых умоў аб вывазцы лесу і патрабуюць платы за вывазку; асабліва гэта бывае, калі лес трэба вазіць з далёкай адлегласьці.

ВОДПУСК ЛЕСУ НА ШКОЛЬНЫЯ БУДЫНКІ.

З водпускам лесу на школьнае будаўніцтва ў большасьці округ справа стаіць вельмі востра: лес позна адпускаецца, так што нельга пасьпець яго вывезьці, адпускаецца часаміза 25-40-50 верст (Менская, Аршанская, Мазырская акругі), адпускаецца ня ў тым ліку і ня тых разьмераў, як трэба. У апошнія часы лясная адміністрацыя стала патрабаваць плату за адпушчаны лес і нават не па ільготнай цане, а па таксе, ды яшчэ з гандлёвай надбавай (Гомельская округа). Патрабуюць платы за лес, апроч Гомельскай, у Віцебскай, Менскай, Слуцкай, Рэчыцкай акругах. Гэтая зьява можа зусім сарваць плян усеагульнага навучаньня.

ДАБРАБЫТ ШКОЛ ПАЛЯПШАЕЦЦА.

Вельмі ўцешным фактам зьяўляецца досыць значнае павялічэньне ў 1926-27 годзе кошту ўтрыманьня аднаго камплекту: з 616 р. 50 к. у мінулым годзе ён павялічыўся да 706 руб., у сярэднім (на 14,6 проц.). Павялічэньне ўтрыманьня школ пайшло, галоўным чынам, на гаспадарчыя і навучальныя патрэбы. У далучаных да БССР Гомельскай і Рэчыцкай акругах кошт утрыманьня аднаго камплекту меншы: у сярэднім—670 р. на год.

1926-27 ГОД ДАЎ СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ.

Падводзячы падрахунак зробленай у 1926-27 годзе працы, трэба адзначыць, што вынікі працы гэтага году трэба прызнаць, наогул, здавальняючымі: а) колькасьць новых школьных камплектаў, адчыненых у гэтым годзе, ня толькі зьдзясьніла плянавыя прапазіцыі, але і перавысіла іх на 13,7 проц.; б) кошт утрыманьня аднаго камплекту павялічыўся на 90 руб., ці на 14,6 проц., што дае рэальную падставу для нармалізацыі працы нашай школы; в) адпушчаны і скарыстаны вельмі значныя сродкі (1.314.289 руб.) на новае школьнае будаўніцтва і капітальны рамонт існуючых уласных школьных будынкаў. Апроч гэтага, трэба яшчэ адзначыць, што ў мінулым годзе вялася і вядзецца зараз кампанія сярод вясковага насельніцтва за нармальны школьны навучальны год і нармальны школьны курс,—каб дзеці ў свой час пачыналі і канчалі заняткі і вучыліся ў 4-гадовай школе ўсе 4 гады. Практычныя вынікі гэтай кампаніі яшчэ дакладна невядомы, але, судзячы па газэтных карэспандэнцыях з месц, у некаторых вясковых мясцовасьцях заняткі ў школах пачынаюцца ўжо раней.

ПЕРАШКОДЫ Ў ПРАЦЫ.

Але ёсьць яшчэ і значныя перашкоды і недахопы ў працы. Сюды трэба аднесьці: а) невыкананьне на 40 проц. пляну новага школьнага будаўніцтва, дзякуючы павялічэньню кошту пабудовы; б) непарадкі на мясцох з водпускам лесу на школьныя будынкі, што ў далейшым можа зусім дрэнна адбіцца на выкананьні пляну ўсеагульнага навучаньня; в) скарыстоўваньне на мясцох адпускаемых грошай не па іх прызначэньню. Відома, што і ў адносінах парналізацыі школы зроблена яшчэ вельмі мала: трэба далейшае павялічэньне кошту ўтрыманьня школ, каб зрабіць працу іх больш нармальнай; такое павялічэньне і прадугледжваецца плянам.

ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ПОЎНАГА ЗЬДЗЯЙСЬНЕНЬНЯ ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ.

Канчатковае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня плянам вызначана ў 1934-35 годзе.

Толькі ў гэтым годзе лік школьных камплектаў працоўнай школы будзе выстарчаючым, каб ахапіць усіх дзяцей 8-11 год. Для гэтага трэба адчыніць яшчэ ў працягу наступных 8 год 6026 новых камплектаў. Пры такім павялічэньні камплектаў, школа ня толькі ахопіць усіх дзяцей школьнага ўзросту, але і будзе працаваць больш нармальна, бо на кожнага настаўніка будзе прыходзіцца ня больш, як 40 вучняў. Плянам прадбачыцца далейшае паступовае павялічэньне кошту ўтрыманьня школ да 1.024 р. на адзін камплект, што значна палепшыць матар'яльнае становішча, а разам з тым, і працу школ; у гэтае павялічэньне не ўваходзіць павялічэньні пэнсіі настаўнікам, якое будзе адбывацца сваім парадкам. На трыманьне ў працягу 8 год адных новых школьных камплектаў патрэбна будзе выдаць 31047656 рублёў.

Пабудова новых школьных будынкаў плянам расьцягнута на наступныя 14 год. Усяго патрэбна будзе пабудаваць будынкі для 8161 школьных камплектаў,

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка гістарычных падзей).

15-28 кастрычніка.

— У Петраградзе адбыўся сход адказных работнікаў Петраградзкай арганізацыі с.-д. бальшавікоў. Абгаварвалася пытаньне аб узброеным паўстаньні. Адмоўную пазицыю да паўстаньня занялі толькі два чалавекі; усе іншыя—за паўстаньне.

— Петраградзкая арганізацыя бальшавікоў у райёнах і вайсковых часьцях правяла рад мітынгаў. З асаблівым посьпехам прайшоў грандыёзны мітынг у цырку „Модерн", дзе часьля прамоў Валадарскага, Луначарскага і Сакольнікава адназгодна прынята наступная рэзалюцыя: „Мы, салдаты, матросы, рабочыя і сяляне... заяўляем: урад Керанскага—гэта ўрад буржуазнай дыктатуры, які вядзе палітыку здрады рэвалюцыі і абману нараду... Мы заяўляем, што ўсе да апошняга чалавека і да апошніх нашых сіл будзем адстайваць пераход усёй улады да саветаў рабочых, салдат і сялян. У гэтым адзіны шлях к міру, зямлі і, наогул, адзіны шлях ратунку рэвалюцыі".

— Раніцай у Смольным адбыўся сход прадстаўнікоў палкавых камітэтаў, выдзеленых для паездкі ў Пскоў, у штаб Паўночнага фронту, на нараду па пытаньні аб выводзе войск петраградзкага гарнізону. На сходзе ўказвалася, што вывад войск з Петраграду—пытаньне раней усяго палітычнае, і што ні адна асобная вайсковая часьць, ні адзін палкавы камітэт не павінны ў імя рэвалюцыйнага адзінства салдат і рабочых вырашаць яго без Петраградзкага Савету; тым больш не павінны вырашаць яго ў данным выпадку, бо штаб, мінаючы Петраградзкі Савет, спрабуе ўвайсьці ў непасрэдныя зносіны з асобнымі часьцямі, спадзяючыся, відаць, што яму ўдасца вывесьці палкі з Петраграду бяз санкцыі і ведама Савету. Сход адназгодна вынес наступную пастанову: 1) пытаньне аб паездзе ў стаўку часова адкласьці, аддаўшы яго на вырашэньне Вык. К-ту Петраградзкага Савету; 2) запрапанаваць штабу Петраградзкага ваеннага вокругу па гэтым пытаньні безадкладна паразумецца з Вык. Кам. Петраґр. Савету.

— Галоўнакам. вайскамі Петраґр. ваеннага вокругу Палкоўнікаў у аб'яве да насельніцтва заклікае захоўваць спакой і паперадак і папераджае, што для прыдушэньня паўстаньня будуць ужыты самыя крайнія меры.

— У Казані на арганізаваны бальшавікамі за горадам салдацкі мітынг зьявіліся ўсе часьці гарнізону ў поўным складзе; пераважаючай большасьцю прынята рэзалюцыя, патрабуючая пераходу ўлады к саветам і заклікаючая Петраґр. Савет і Ўсерасейскі Зьезд Саветаў к захвату ўлады і перадачы зямлі ў рукі народу. Мітынг паслаў прывітаньне Петраградзкаму, Маскоўскаму і Кранштадзкаму Саветам, як аванґарду расейскай рэвалюцыі, і не правадыру Леніну.

— У Маскве адбылася дэманстрацыя рабочае моладзі—пратест супроць вайны, арганізаваная саюзам моладзі пры Маскоўскім к-це РСДРП(б) і саюзам рабочае моладзі „III Інтэрнацыянал". Перад будынкам савету адбыўся мітынг, які вынес рэзалюцыю з патрабаваньнем пераходу ўлады ў рукі Саветаў.

— У Армавіры зачынілася зьезд саветаў Р. і С. Д. Паўночнага Каўказу. Зьезд прыняў рэзалюцыю аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў. Утворан краёвы цэнтр саветаў Паўночнага Каўказу.

— **Менскі Савет Р. і С. Д. рашыў прыступіць да экспрапрыяцыі памешчыцкіх зямель і маемасьці і перадачы іх селянам.**

Хроніка.

ЯК ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

— Гута „Пралетары"—з ліку рабочых падпісалася 95 проц. на суму, у адносінах да заработнае платы 30 проц.

— „Цэнтрасьпірту"—падпісаліся ўсе на суму 55 проц., у адносінах да зарплаты.

— Цагельня № 3—рабочыя падпісаліся на ўсе 100 проц., на суму 54 проц. у адносінах да зарплаты.

— Наркамзем—лік падпішчыкаў 90 проц. у адносінах да агульнага ліку служачых, сума падпіскі складае 50 проц. у адносінах да зарплаты, на аднаго падпісьчыка ў сярэднім прыпадае 60 руб.

— „Белдзяржсьпірт"—падпісалася 92 пр. Сума падпіскі 21,6 пр. у адносінах да зарплаты.

— Цэнтральная аптэка—усе 100 проц. служачых падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі, у сярэднім на кожнага падпішчыка прыпадае 20 руб. Падпіска ў адносінах да зарплаты складае 35 проц.

— Дзяржбанк—з ліку служачых 99 пр. падпісаліся на пазыку, у сярэднім на кожнага падпішчыка прыпадае 70 руб. Сума падпіскі ў адносінах да зарплаты складае 71 проц.

— Прамбанк—усе 100 проц. служачых падпісаліся на пазыку, у сярэднім на аднаго падпішчыка прыпадае 50 руб. У адносінах да зарплаты падпіска складае 50 проц.

— Тэкстыльсьндыкат—усе супрацоўнікі падпісаліся на пазыку; сярэдняя падпіска ў адносінах да зарплаты—75 проц.

АДСТАЮЦЬ.

— 1-ая гарбарня, 2-ая гарбарня, склады, 3-ці дзяржкозавод, гарбарня ФЗУ—з ліку 400-х чалавек на пазыку падпісалася ўсяго 178 чалавек. Падпіска ў адносінах да зарплаты складае ўсяго толькі 12 проц.

— Белжылсаюз—падпісалася ўсяго толькі 55 проц. служачых. Падпіска складае 25 проц. у адносінах да зарплаты.

— Цагельня № 1—рабочыя падпісаліся толькі на 49 проц. на суму, у адносінах да зарплаты—45 проц.

— Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт—падпісаліся на пазыку ўсяго 30 проц. на суму, у адносінах да зарплаты—3 проц.

29 кастрычніка—пленум Гарсавету.

У суботу, 29 кастрычніка, адбудзецца нашыраны пленум Менскага гарсавету з удзелам рабочых мясцовых фабрык і заводаў. На пленуме будзе заслухан даклад аб дасягненьнях савецкага будаўніцтва за 10 год.

«10 год савецкага мастацтва».

30-га кастрычніка а 12-й гадзіне дню ў памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Тэатру Наркамасьветы тав. Баліцкі зробіць даклад на тэму: „10 год савецкага мастацтва". Пасьля дакладу дэклямацыя, сьцены і музычныя нумары.

Падрыхтоўка да будаваньня унівэрсытэцкага гарадка.

Калегія Наркамасьветы вырашыла весьці будаўніцтва ўнівэрсытэцкага гарадка не гаспадарчым спосабам, а шляхам здачы з таргоў. У сувязі з гэтым выдзелена камісія, якой даручана перапрацаваць праэкт палажэньня аб унівэрсытэцкім будаўніцтве.

Земляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў.

Па заданьні Нарказемляроблства Беларусі, да 1-га верасьня г. г. перададзена яўрэйскаму насельніцтву 1895 дзесяцін, на якіх населена 170 сем'яў. Апроч гэтага, намячаецца перадаць яшчэ 937 дзес. на 115 сем'яў.

Дапамога беспрацоўным.

Як мерапрыёмства па барацьбе з беспрацоўем, Наркампрацы БССР праводзіў грамадзкія работы, пашыраў працкалектывы і г. д. На гэтыя мерапрыёмствы Наркампрацы ў 1925-26 г. патрацілі—2477700 руб., а ў 1926-27 г.—3201300 руб.

Новае абсталяваньне для бабруйскага камбінату „Лесбелу".

На днях з Нямеччыны праз Управу Дзяржгандлю БССР атрыманы новыя машыны для рэзкі фанэры на абсталяваньне бабруйскага камбінату „Лесбелу".

Колькі ў БССР хатняй жывёлы.

Водлуг даных Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, у 796583 сельскіх гаспадарках Беларусі налічваецца: коняй—1077566, буйнай рагатай жывёлы—2162712, авец—3153582, коз — 4389, сьвіней—2276891. Усяго па БССР сёлета зарэгістравана—8675140 штук жывёлы. У мінулым годзе было—8294160 штук.

Колькі працкалектываў у БССР.

На 1-га жніўня г. г. у БССР налічвалася 238 працкалектываў, з якіх вытворчых 158, працоўных—46 і гандлёвых—34.

У працкалектывах занята 6918 чал. беспрацоўных.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Выступленьне для дэлегатаў Усеб. Зьезду Прафсаюзаў.

30-га кастрычніка ў клюбе савгандальслужачых адбудзецца выступленьне прафсаюзных гурткоў ФК для дэлегатаў Усебарускага Зьезду Прафсаюзаў. У праграме—парад праф. гурткоў, гімнастыка на прыладах, фізкультурныя танцы, фехтаваньне і піраміды. Прымае ўдзел каля 400 фізкультурнікаў.

Полацкія фізкультурнікі—к Кастрычнікаваму сьвяту.

У правядзеньні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычніка ў рэвалюцыі ў Полацку мясцовыя фізкультурнікі прымуць самы чынны ўдзел.

6-га лістапада адбудуцца гарнізонныя стралковыя спаборніцтвы. Увечары пасьля пасяджэньня гарсавету — выступленьне спартгрупы АСФК. На пляцу «Волі»—выступленьне фізкультурнік КСМ з находнямі і вайсковых ф-каў з вінтоўкамі.

7-га таксама выступленьне спартгруп на спартпляцоўцы — міжгародні футбольны матч і баскетбольны матч на першынства гораду.

Год працы краязнаўчага т-ва БДУ.

У жыцьці беларускага савецкага студэнцтва заўважаецца значны пералом у бок зацікаўленнасьці навуковай і навуковымі пытаньнямі. Побач са студэнцкімі грамадзкімі арганізацыямі (Авіяхім. Монр, ячэйка „праф напісьменнасьці" і г. д.). Пачалі арганізоўвацца навуковыя гурткі.

Але гэтыя аматарскія гурткі ня мелі нічога супольнага з краязнаўствам.

І вось, год таму назад у Бел. Дзяржаўным Унівэрсытэце з'арганізавалася сталае краязнаўчае таварыства, якое паставіла галоўнай мэтай—усебаковае вывучэньне сваёй краіны ва ўсіх напрамках.

Ня гледзячы на цяжкія ўмовы працы ў першым годзе (адсутнасьць сродкаў, памяшканьня, вялікая перагружанасьць студэнцтва і г. д.), студэнцкаму навукова-дасьледчаму краязнаўчаму т-ву ўдалося зрабіць вельмі шмат.

Апрача вялікай арганізацыйнай працы, утворана і афармлена 6 сэкцый: прыродазнаўча-географічная, сацыяльна-эканамічная, культурна-гістарычная, мэтадычная і сэкцыя мовы і літаратуры.

У сэкцыях разгорнута шырокая праца. Так, у мэдычнай сэкцыі прачытаны самімі студэнтамі навукова-дасьледчыя даклады: „Народная мэдыцына"—як і чым лечыцца наша сучасная вёска, „Вальляк у Менску", „Вальляк у Віцебчыне і Аршаншчыне", „Спробы дасьледваньня санітарна-гігіенічнага стану Ісэрскага с.-с., „Санітарна-эканамічныя ўмовы жыцьця вёскі" і інш.

У культурна-гістарычнай сэкцыі распрацованы і прачытаны даклады: «Гісторыя міліцыі БССР», „Менская батлейка", „Аб раскопках у Ізяслаўі" і шэраг іншых.

У сацыяльна-эканамічнай сэкцыі прачытан даклад: „Прывілеі 1447 году як крыніца статуту 1529 г." і інш.

Апрача навукова-дасьледчай працы ў сэкцыях, т-ва правяло студэнцкую навукова-дасьледчую экспэдыцыю ў Мазырчыну.

Экспэдыцыяй зроблена і вялікая грамадзка-культурна-асьветная праца: сярод сялянства праведзена 30 папулярных лекцый і дакладаў на розныя тэмы.

Т-ва навінна вывіцца інстытутам для студэнцтва ў сэнсе вылучэньня новых працаўнікоў навукова-дасьледчай працы.

Янка Марун.

На Менскім вячэрнім рабфаку ня ўсё добра.

Менскі вячэрні рабфак пачаў працу з 19 кастрычніка. Першым тормазам у працы зьяўляецца адсутнасьць падручнікаў, якіх рабфак зусім не дае, а прыходзіцца самім студэнтам купляць іх, а набыць усе падручнікі студэнты бязумоўна ня могуць. Каб зьнішчыць гэту перашкоду, адміністрацыі дзённага рабфаку трэба вылучыць частку падручнікаў для вячэрняга рабфаку.

Далей, перашкаджае працы адсутнасьць раскладу заняткаў, а таксама і тое, што не зьяўляюцца некаторыя настаўнікі.

Калі гэтак справа будзе стаяць і далей, дык вынікаў добрых ад вучобы чакаць ня прыходзіцца.

Трэба зьвярнуць на вячэрні рабфак больш увагі, каб 4 гадзіны, якія прызначаны ў дзень на заняткі, выкарыстоўваліся на 100 процантаў.

Рабфанавец.

ПАСТАНОВЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб назначэньні тав. Юргенсона, П. Я., членам Калегіі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

Савет Народных Камісараў Беларускае ССР пастанаўляе назначыць тав. Юргенсона, Паўла Якаўлевіча, членам Калегіі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карылін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.

24 кастрычніка 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о назначении тов. Юргенсона, П. Я., членом Коллегии Народного Комиссариата Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР.

Совет Народных Комиссаров Белорусской ССР постановляет назначить тов. Юргенсона, Павла Яковлевича, членом Коллегии Народного Комиссариата Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карилин.

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

24 октября 1927 г.
г. Минск.

БІБЛІАГРАФІЯ.

Дзіцячы тэатр.

Васіль Сташэўскі. „Сашка будаўнік" (п'еска ў 2-х дзеях), „Ма другі дзень" (п'еска ў адной дзеі), „Бяспрытульныя" (п'еска ў адной дзеі). Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск—1927 г.

Час ад часу Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва выдае дзіцячую літаратуру. Нязначны процант у гэтай дзіцячай літаратуры прыпадае на сцэнічныя творы. Наш кніжны рынак яшчэ не задаваляе патрэб дзіцячага, школьнага тэатру. На рынку няма выбару.

Вось і цяпер выйшлі з друку тры п'ескі В. Сташэўскага, належачыя да серыі „Дзіцячы Тэатр". Што-ж уяўляюць з сябе гэтыя п'ескі. Звычайна, карысна ў рэцэнзіі, з практычнымі мэтамі, перадаць сюжэт сцэнічнага твору, каб спажывец мог загадзя ведаць аб тым, што здабывае для настаноўкі.

Так, п'еска „Сашка Будаўнік" мае наступны сюжэт: вучань Сашка будуе на выстаўку мадэль беларускай хаткі. Будоўля ўскладнена тым, што бацька не дазваляе псаваць інструмантаў. Аднак, ня гледзячы на труднасьці, хатка пабудавана. На выстаўцы Сашка атрымлівае пахвальны ліст і ўзнагароду (сякеру, пілку, малаток і серп). Сякера і піла Сашкай аддаецца ў хату, бацька бачыць рэальны вынік працы і дазваляе Сашку запісацца ў піанэры. Серп-жа і малаток Сашка прыносіць у школу, дзе яны, зьяўляючыся эмблемаю, застаюцца памяткай аб Сашку-будаўніку.

П'еска зьяўляецца на сюжэту прапагандыстым за набыцьцё тэхнічных ведаў нашымі дзецьмі—школьнікамі.

„На другі дзень"—сцэнічны абразок з часоў вызваленьня Беларусі Чырвонай арміяй у 1920 г. На другі дзень пасьля адступленьня палякаў, якія выпалілі мястэчка—пастушкі гутараць паміж сабою аб падзеях, зьвязаных з адступленьнем палякаў. Пастушкі шкадуюць, што малыя, а то-б і яны пайшлі біць паноў. Да пастушкоў трапляе старац (чамусьці ў беларускай сцэнічнай творчасьці без яго абыйсьціся нельга), які і апавядае дзецям пра жыцьцё „за панамі".

Дзея ў абразку падменена развагамі, што бязумоўна зьмяншае вартасьць твору для дзіцячага тэатру, у якім заўсёды канкрэтная дзея, учынні павінны пераважаць над аддягненымі развагамі.

Сцэнічны абразок „Бяспрытульныя" дае гледачу сцэнку з быту „пад плотам". Пад плотам дрыжаць ад холаду бяспрытульныя. Частка з іх выказваецца за жыцьцё ў дзіцячым доме, частка-ж задаволена жыцьцём і займаецца пакражамі. Тая частка (што хоча трапіць у дзіцячы дом) накіроўваецца шукаць яго (як гэта да некаторай ступені ваіўна), навадыра зладзеў—„Махно" арыштоўвае міліцыянэр, а двое з бяспрытульных застаюцца пад плотам... (чакаць у мора пагоды?).

Мусім сказаць, што п'еска вельмі наіўна напісана, аўтар незнаёмы з бытам бяспрытульных. Хоць гэта і спроба адбіць жыцьцё „пад плотам", але яно далёка да тае мастацкае сапраўднасьці, якая адбіта ў аповесьці „Рэспубліка ШКІД"—на расейскай мове.

Агульныя заўвагі да ўсіх п'есак: аўтар занадта сьмела для дзіцячага тэатру ўжывае лаянку: „нахай іх халера", „каб з вас духі пусьціла"..., „я вам зараз пакажу"... (недасказана аўтарам размова бабы ў п'есцы „На другі дзень"). Таксама і з мяшкамі бяспрытульных: „Буцел", „Шпец", „Цыган", „Махно". Тое, з чым змагаецца савецкая школа,—аўтар прапагандуе ў сваіх творах. Хто можа быць упэўнены ў тым, што пасьля пастаноўкі, артысты ня будуць „яхрыпчаны" дзецьмі - таварышамі ў „буслаў", „шпецаў", „цыганоў", «Махноў»?..

Мы ўправе павінны былі чакаць ад Сташэўскага большай сцэнічнай апрацованасьці гэтых п'есак у сэнсе большай выпукласьці і яскравасьці пададзенага матар'ялу.

Аднак, у нашых умовах, п'ескі зпойдуць спажыўца ў асобе драматычных гурткоў у нашых школах.

Чаму так дорага расцэнены Выдавецтвам такія невялікія сшыткі? Чаму гэта масавая літаратура павінна прадавацца па 20 к. за адзін друкаваны аркуш паперы?

Бязумоўна, выйсьцем п'есак Сташэўскага попыт на сцэнічныя творы для школьнага тэатру на кніжным рынку ня вычэрпуся і прыходзіцца ад БДВ чакаць новых кніжак серыі „Дзіцячы Тэатр".

Беда.

Сельская гаспадарка.

С.-Г. ВЫСТАЎКІ Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

«Сьвята ўраджаю» ў Менскай акрузе распачнецца 30-га кастрычніка. З 15-га кастрычніка па ўсіх сельсаветах праведзены дробныя с.-г. выстаўкі, з якіх былі ўзяты лепшыя экспанаты для райённых с.-г. выставак. Выстаўкі будуць выключна па палявodзтву, садоўніцтву і пчалярству. Толькі па некаторых райёнах будуць выстаўкі па сьвінаводзтву.

Асыгнаваны пэўныя сумы на выдачу прэмій за лепшыя экспанаты і лепшае вядзеньне сельскай гаспадаркі ў выглядзе с.-г. прылядаў, розных машын, ганаровых дыпломаў і інш. Прэміі будуць выдавацца паасобным гаспадаром, савецкім гаспадаркам, калектывам і цэлым пасёлкам.

Выстаўкі павінны адбіць нашы дасягненьні ў галіне сельскай гаспадаркі за апошнія 10 год. У сувязі з гэтым на выстаўках будуць прадстаўлены розныя дыяграмы, якія пакажуць рост сельскай гаспадаркі, а таксама экспанаты тых культур, якія пашырыліся ў нас пасьля кастрычнікавага перавароту.

Для правядзеньня «сьвята ўраджаю» сёньня выяжджае на райёны аграномічны нарсанал і працоўнікі Менскага зямельнага аддзелу.

ВЫСТАЎКА Ў ДОМЕ СЕЛЯНІНА.

У Цэнтральным Доме Селяніна будзе наладжана выстаўка экспанатаў Менскай балотнай станцыі і вопытнай аграномічнай станцыі.

НАРАДА ПА ПЧАЛЯРСТВУ.

14-га лістапада пры Наркамземе будзе склікана нарада акруговых інструктароў па пчалярству. Нарада мае абмеркаваць цэлы шэраг пытаньняў: як лепш забясьпечыць пчаляроў патрэбнымі прылядамі, дасьледаваньне пчалярскай гаспадаркі БССР, каапераваньне пчаляроў і інш.

ЭКСПАНАТЫ НА ВІЦЕБСКУЮ МАЛОЧНУЮ ВЫСТАЎКУ.

Менская акруга чынна рыхтуецца да малочнай выстаўкі, якая адчыняецца ў Віцебску 6-га лістапада. На выстаўку будзе паслана вытворчасьць малочных т-ваў, с.-г. калектываў, савецкіх гаспадарак і паасобных гаспадароў.

ЧЫРВОНА-БЕЛАРУСКІ ГАТУНАК БЫДЛА.

Чырвона-беларускі гатунак быдла, якое згрупавана, галоўным чынам, у Самахвалаўскім і Койданаўскім райёнах, Менскай акругі, у сучасны момант зьяўляецца аб'ектам дэтальнага вывучэньня прадукцыйнасьці яго.

Вопыты ў 1926 г. паказалі, што ў сярэднім, са 128 кароў пры звычайным харчаваньні карова 19 п. 28 ф. жывой вагі давала ў дзень 11 ф. малака, а пры паказальным харчаваньні ўдой малака павялічыўся да 17,5 ф.

У 1927-28 г. праца т-ва па гадаваньні і вывучэньні якасьці чырвона-беларускага быдла будзе значна пашырана. Мае быць арганізавана сыстэматычны запіс удояў, дасьледаваньне тлустасьці малака і інш.

Пра некаторыя шляхі барацьбы з самагонам.

(Водлуг матар'ялаў абсьледваньня НК РСІ).

Той факт, што самагон у вёсцы яшчэ мае шырокае распаўсюджаньне, зьяўляецца вялікім злом як для вёскі, так і для дзяржавы ў цэлым, бадай што не патрабуе доказаў.

Разьвіцьцё самагонакурэньня за апошнія 10 год зьявілася ў выніку адсутнасьці на рынку хлебнага віна.

З прычыны лёгкасьці вырабу самагону з хлеба, ужываньне яго насяленьнем дасягнула, асабліва ў перыяд 1919-24 г., вялізных памераў.

Пасьля выпуску ў продаж 40-градуснага хлебнага віна, памеры самагонакурэньня паступова пачалі зьмяншацца, але ўсё-ж такі і да сучаснага моманту яно досыць моцна разьвіта, асабліва ў глухіх вясковых кутках.

Як моцна разьвіта самагонакурэньне ў Беларусі, можна бачыць хоць-бы з наступных даных: калі да вайны сярэдняе гадавое ўжываньне хлебнага віна складала 0,4 вядра, ці 8 бутэлак у 40 гр. на чалавека, пры амаль поўнай адсутнасьці тайнага вінакурэньня, дык у 1926-27 г. мы маем менш 2-х бутэлак на аднаго чалавека. Фактычнае-ж ужываньне віна на менш даваеннага. А калі ўзяць пад увагу, што пры разьвіцьці самагонакурэньня лік алкаголікаў павялічыўся, дык фактычнае ўжываньне значна перавысіць даваеннае. Бяручы рэалізацыю хлебнага віна на 2 бутэлькі на душу, мімаволі прыходзіцца паставіць пытаньне: за лік чаго папаўняецца гэты недахват сьпіртусовых напіткаў? Калі нават дапусьціць, што насяленьне Беларусі ў выніку культурна-асьветнай працы зьменшыла ўжываньне сьпіртусовых напіткаў напалову і замест 8 бут. на душу прыходзіцца толькі 4, дык і тады памеры самагонакурэньня будуць вялізнымі.

Вось чаму пытаньне аб барацьбе з самагонакурэньнем заслугоўвае асаблівай увагі як з пункту гледжаньня нашай грамадзкасьці, так і інтарэсаў дзяржавы.

Абсьледваньне НК РСІ выявіла, што адной з прычын разьвіцьця самагонакурэньня зьяўляецца слабое абслугоўваньне вёскі хлебным віном.

Зусім ясна, што наколькі вёска хлебным віном не здавольваецца, а патрэба ў ім ёсьць, дык яго месца заняў самагон. У гарадох і мястэчках „Цэнтрасьпірт" і каапэрацыя гандлююць хлебным віном, а ў вёсцы, як і раней, пануе самагон.

Роўналежная праца каапэрацыі з Цэнтрасьпіртам і пажаданьне каапэрацыі працоўцца глыбей у вёску, зьяўляецца ў выніку правільнай камэрцыйнай лініі беларускай райённай управы „Цэнтрасьпірту", які ўцягнуў каапэрацыю гандаль хлебным віном.

Калегія РСІ прызнала гэткае становішча ненармальным і заправанавала «Цэнтрасьпірту" разьмяжаваць сфэру ўплыву паміж ім і каапэрацыяй в такім разьлікам, каб у тых насельных пунктах, дзе працуе ці можа працаваць каапэрацыя, „Цэнтрасьпірт" не адчыняў сваіх крам, а ўзмацняў сваю сетку ў гарадох і вялікіх гандлёвых пунктах.

Далей РСІ прызнала неабходным, у мэтах уцягваньня каапэрацыі ў гандаль хлебным віном у менш ёмкіх пунктах, даць каапэрацыі скідку, як меру падахвочваньня да большага абхвату праз каапэрацыю вясковага рынку.

Усе гэтыя мерапрыёмствы, поруч з актыўным удзелам перадавой часткі вёскі ў барацьбе з самагонакурэньнем, значна яго аслабіць.

Ліўшыц і Хмялеўскі.

Адказы карэспандэнтам.

Будзен (Бярэзінскі р.). На ваш ліст заг. зямельнай часткі даў адказ, што хадайніцтва Тамаровіч здаволіць нельга.

Малапісьменнаму (Пятрыкоўскі р.). Па вашаму допісу высьветлена, што цеганіна са зваротам нераплаты падатку сем'ям чыр-цаў і інш. залежыла ад нядбайнасьці сельсаветаў.

Студэнту Майскаму. Па допісу „Выкараніць хваробу з Полацкага Бел. пэдтэхнікуму" высьветлена, што заняткі ў тэхнікуме пачаліся 10 верасьня па прычыне рамонту, на які адпушчана 11.000 руб.

Рамонт пачаўся своячасова—21 чэрвеня, адразу пасьля заканчэньня навучальнага году.

Барэц. Па вашаму допісу «С-с за справядлівасьць», Горацкі РВК склаў акт і ўзьняў хадайніцтва перад АВК аб адабраньні ад Баркоўскіх няправільна надзеленай ім зямлі.

Б. Пар. Кам. Аховы Здароўя паведамляе, што зьмест нататкі „Санаторы распаўсюджвае заразу" не пацьвярджаецца.

Ачавідцу. Зьмест вашага допісу „Ці змогуць у кішэні рэвізію зрабіць" не адпавядае сапраўднасьці.

Сялянскі палац.

(ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ СЕЛЯНІНА).

Савецкая ўлада Беларусі і камуністычная партыя вялікую ўвагу зьвяртаюць на ўзьняцьце культурна-асьветнага стану сялянскіх працоўных мас.

Адным з такіх культурна-асьветных вогнішчаў для сялянства зьяўляюцца дамы селяніна. Значэньне іх цяпер добра вядома работніку як гораду, так і вёскі. На жаль, разруха, якую мы атрымалі ў спадчыну ад царызму, панскай акупацыі і розных контр-рэвалюцыйных банд, доўга не давала магчымасьці гэтым дамы сялян вывесьці з хібарак у палацы. Аднак, дзесяцігодняя напружная праца працоўных мас, ня гледзячы на воражасьць і нянавісьць капіталістычна - буржуазных краін, узмацніла і адрадзіла дабрабыт Савецкага Саюзу.

У момант пэўных эканамічных дасягненьняў Наркамзем Беларусі прыступіў у 1926 г. да арганізацыйна-падгатоўчай працы па пабудове ў Менску Цэнтральнага Дому Селяніна рэспубліканскага значэньня. Месца для пабудовы, па ўзгадненьні в Менскім акруговым выканкомам, выбрана ў цэнтры гораду з такім разрахункам, каб селянін, заехаўшы ў ЦДС і атрымаўшы прыпынак, меў магчымасьць, ня блытаючыся на горадзе, адразу трапіць ва ўстановы па справах, па якіх ён прыехаў у горад.

Для распрацоўкі архітэкт. праэкту будынку ЦДС быў абвешчаны ўсесаюзны конкурс з выдачай прэмій за лепшы праэкт.

На конкурс прыслана досыць значная колькась праэктаў, а для выбару з іх лепшых і прысужэньня прэмій была ўтворана камісія з прадстаўнікоў навуковых, дзяржаўных, грамадзкіх і партыйных устаноў з удзелам спэцыялістых. Дом Селяніна, згодна прынятага праэкту, будзе зьмяшчаць: залю для с.-г. музэю, тэатр, кінематограф, бібліятэку - чытальню, сталоўку, пакоі для жыльля сялян, пакоі аградапамогі, дапамогі юрыдычнай, па гігіене і санітарыі, Осо-Авіяхіму, некалькі пакояў з адпаведным абсталяваньнем дзіцячых ясьляў,—каб гэтым самым даць магчымасьць селяніну і сялянцы-матцы навочна ўбачыць, як будаваць сваю і дзяржаўную гаспадарку, як лепей дагледаць і выхоўваць дзяцей.

Праведзеная такім чынам падрыхтоўча-арганізацыйная праца дала магчымасьць НКЗему ўвосень 1926 г. на сродкі, адпушчаныя Саветам Народных Камісараў Беларусі ў суме 100000 руб., зрабіць загатоўку належных будаўнічых матар'ялаў і часткова распачаць работу. З вясны гэтага 1927 году было прыступлена да будаўніцтва ў поўным абхвацe, прычым намечаная праграма на гэты будаўнічы сэзон будзе выканана на ўсе 100 проц.

Належыць заўважыць, што для абсталяваньня ЦДС будзе дастасована ўсё, што ёсьць новага ў навуцы па гэтым пытаньні (цэнтральны абаграў, вэнтыляцыя, мэханічная кухня і г. д.). Пры доме абсталёўваецца лазьня, прачашная і дэзынфэкцыйная камера, паогул, усё тое, што зьвязана з чыстатой, гігіенай, а, значыць, і здароўем чалавека.

Такім чынам, бачым, што беларускі селянін, урэшце, забыўся быць «быдлам» у паноў, а, стаўшы побач з рабочым фабрык і заводаў гаспадаром і ўладаром сваёй краіны, служыць прыкладам для сялян усіх прыгнечаных краёў, дзе панує ўціск, гвалт і паняверка.

Гэтыя дасягненьні даў беларускаму селяніну Вялікі Кастрычнік. Гэтаму навучыла і навучае камуністычная партыя, ажыцьцяўляючы вялікі завет Леніна.

Р.

Апавяшчэньні.

— У суботу, 29 кастрычніка, а 12 гадз. дня ў залі пасяджэньняў Менакругкому КП(б)Б адбудзецца ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ з наступнай павесткай дня:

1) Аб маршруце (т. Кроль), 2) даклад Культадзелу ЦСПСБ аб ходзе падрыхтоўкі (т. Конанаў), 3) аб ходзе ўсесаюзнага камсамольскага суботніка (т. Шнейдар,) 4 канчатковы плян сьвята (т. Гершон), 5) аб разьмеркаваньні ілюбаў (т. Гальбрайх), 6) аб дарэчных вечарох у тэатрах і кіно (т. т. Табайнік і Галкін).

— З прычыны таго, што ў пятніцу, 28 кастрычніка, з 7-ай гадз. вечара адбываюцца заняткі ў партшколах, кансультацыя тав. Ванкевіча на тэму „Утомляемость преподавателя при преподавании" пераносіцца з 7-й гадз. веч. на 9. г. 30 м. вечара таго-ж дня.

— АПА Менскага АК КП(б)Б абвешчае, што цэнтральны габінет Агітпрапрацы дадатковa адчынен ад 1 да 3 гадз. дня, пачынаючы з 28 кастрычніка да 5 лістапада для дакладчыкаў аб 10-й гадав. Кастрычнікавай рэвалюцыі. Увечары габінэт будзе працаваць ад 6 да 10 гадз. вечара. 6, 7 і 8 лістапада габінэт будзе зачынен.

ПЭДГАБІНЭТ.

—Сёньня, 28-х, а 7 гадз. увечары адбудзецца сход фізыка-матэматычнага гурткa. На парадку дню—даклад на тэму: «Эвалюцыя поглядаў на выкладаньне матэматыкі ў XIX стагодзьдзі».

— 1-ы групном саюзу асьветы просіць членаў саюзу зьявіцца на вечар успамінаў, у сувязі з 10-ігодзьдзем Кастрычнікавай рэвалюцыі, які адбудзецца 30-х а 8-й гадз. увечары ў Доме Асьветы.

На вечары з успамінамі выступаць т. т.: Ігнатоўскі, Чарот, Сянкевіч і Колас.

— Цэнтральнае Праўленьне Саюзу Беларпрацасаветы паведамляе ўсіх беспрацоўных саюзу Працасьветы, што з 2 па 15 лістапада ЦП адбудзецца перапіс беспрацоўных у наступным парадку:

Беспрацоўныя па прозьвішчу на літары «А» і „Б" зьяўляюцца—2 лістапада, «В» і „Г"—3 лістапада, «Д», „Е", „Ж", «З» і „І"—4 лістапада, „К"—5 лістапада, „Л" і „М"—9 лістапада, „Н", „О", „П" і „Р"—10 лістапада, „С", „Т", «У» і „Ф"—11 лістапада, «Х», „Ц", „Ч", „Ш", „Э", „Ю",—„Я" 12 лістапада.

Перарэгістрацыя будзе праходзіць у памяшканьні Дому Асьветы (Камуністычная 19, 1-ы паверх, 4 паной) ад 11 з пал. да 3 з пал. гадз. дню.

Рознае.

ПРА ДАСЯГНЕНЬНІ СССР.

У Амэрыцы выходзіць праца ў дзесяці томах, прысьвечаныя будаўніцтву і культуры СССР. Гэту працу склала група выдатных амэрыканскіх вучоных, пад рэдакцыяй прафэсара Джэрома Гвіс.

ЗАПРАШЭНЬНЕ АКАДЭМІКА ІПАЦЬЕВА Ў НЯМЕЧЧЫНУ.

Расейскі акадэмік В. Іпацьеў запрошан кіраваць працай навуковай лябараторыі асацыацыі баварскіх хімічных заводаў.

В. Іпацьеў будзе выяжджаць у Нямеччыну дзеля гэтай працы 3—4 разы ў год.

НОВЫ СПОСАБ ПРАСУШКІ ДАМОЎ.

У Нямеччыне практыкуецца новы спосаб прасушкі нацава пабудаваных дамоў. У новы дом накачваецца спэцыяльнымі машынамі гарачае паветра. Такім спосабам новы дом прасушваецца ў працягу некалькіх гадзін.

ЗМАГАНЬНЕ З ТУБЭРКУЛЁЗАМ.

Летась у СССР налічвалася 363 тубэркулёзных дыспансэры. За апошнія 7 гадоў колькасьць іх у СССР узрасла ў 50 разоў. А ў Злучаных Штатах за 15 гадоў колькасьць турбэркулёзных дыспансэраў узрасла ўсяго ў 33 разы.

ГАДЗІНЬНІК, ЯКІ ГАВОРА.

У Чыкаго адна фірма гадзіньнікаў выпусьціла гадзіньнікі, якія гавораць.